WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 МАЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 90
(26954)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ДЗМІТРЫЙ МЯДЗВЕДЗЕЎ АБМЕРКАВАЛІ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў МЫТНЫМ САЮЗЕ І АЭП

**Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў абмеркавалі тэму супрацоўніцтва ў рамках Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі. У прыватнасці, размова ішла аб перспектывах удасканалення гэтых інтэграцыйных аб'яднанняў. Кіраўнікі дзяржаў таксама абмеркавалі актуальныя пытанні двухбаковых адносін. У цэнтры ўвагі была тэма эканамічнага супрацоўніцтва. У тым ліку абмяркоўвалася пытанне крэдытнай падтрымкі для стабілізацыі валютнага рынку Беларусі.

## БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ФАКТЫЧНА ЗАВЯРШЫЛІ ПЕРАГАВОРНЫ ПРАЦЭС ПА ПРАДАСТАЎЛЕННІ КРЭДЫТАЎ

**Аб гэтым 17 мая Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку далажыў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

«Я толькі што гаварыў з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Анатолевічам Мядзведзевым. Ён пазваніў мне. У нас ідуць перагаворы з Расійскай Федэрацыяй аб прадастаўленні стабілізацыйнага крэдыту на падтрыманне курсу беларускага рубля. Па ўсіх перагаворах яны гатовы да таго, каб тэрмінова, калі гэта патрэбна, і не тэрмінова, калі гэта нам не патрэбна, адрэагаваць. І гэта прыкладна $3,1 млрд, калі мы, вядома, будзем падпісваць з імі адпаведнае пагадненне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, цяпер усё практычна ўжо зроблена, і Беларусь можа атрымаць гэты крэдыт.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Прыкладна $3 млрд — гэта будучыя продажы нашых тавараў. Нас гатовы пракрэдытаваць. У выніку атрымліваецца 6 з лішнім мільярдаў долараў — гэтага дастаткова ў гэтым годзе не толькі для стабілізацыі, але і для таго, каб мець салідныя золатавалютныя рэзервы».

«Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што эканоміка ў нас усё-такі расце, ВУП 112,3 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года — гэта высокі паказчык. Зразумела, крыху сродкаў не хапае, паколькі яшчэ высокія цэны на нафту, сыравіну, камплектуючыя і г.д. Гэта аб'ектыўна. Але гэта часовыя цяжкасці, і я хацеў бы, каб урад і Нацыянальны банк не вельмі ўжо тут стараліся ў плане пазыковых сродкаў, таму што іх трэба будзе вяртаць. Таму арыентацыя на тое, што жыць трэба па сродках», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Я спецыяльна тыдзень быў у сельскагаспадарчых арганізацыях, глядзеў, што ж там адбываецца, — сказаў Прэзідэнт. — Ніякай катастрофы няма, гаспадаркі працуюць устойліва, нармальна, а вось што цяпер адбываецца на валютным і спажывецкім рынку ў цэлым па краіне, я хацеў бы ад вас пачуць. Толькі аб'ектыўна. Усё, што адбываецца. Калі патрэбна, каб я цяпер кінуў усе справы і падключыўся да гэтага пытання, — добра. Давайце я буду займацца. Калі пакуль сітуацыя кіруемая і вы бачыце перспектывы, тады не будзем гарачыцца, будзем спакойна ў гэтым напрамку дзейнічаць».

«Мне, як вы ведаеце, дакладвае група, якая займаецца маніторынгам валютнага і спажывецкага рынкаў. Я хацеў бы ад вас пачуць пра ўсё, што адбываецца на валютным і спажывецкім рынках перш за ўсё. Я ведаю, вы ўчора збіраліся і быццам выпрацавалі яшчэ адно чарговае рашэнне. Але яшчэ раз хачу вас папярэдзіць, каб вы мне прадставілі аб'ектыўную ацэнку, каб я, нарэшце, мог зрабіць пэўныя вывады, таму што дакладчыкаў шмат, а вывад павінен быць адзін», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прэм'ер-міністра.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў: «Мы фактычна завяршылі перагаворны працэс з Расійскай Федэрацыяй. У прынцыпе ўсе пытанні ўрэгуляваны. І цяпер міністрам фінансаў Беларусі Андрэем Харкаўцом і міністрам фінансаў Расіі Аляксеем Кудрыным абмяркоўваюцца канчатковыя матрыцы». У ходзе праведзеных перагавораў у мінулую нядзелю ў Мінску з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства фінансаў і Цэнтральнага банка Расіі былі абмеркаваны падыходы да крэдытавання. «Сёння Аляксей Кудрын праінфармаваў сваё кіраўніцтва, я далажыў Прэзідэнту Беларусі. Такім чынам, мы дамовіліся фактычна на $3-3,5 млрд крэдытнай падтрымкі з боку Расіі на выгадных умовах. Акрамя таго, ёсць яшчэ прапановы, і яны фактычна адобраны Прэзідэнтам, па атрыманні адпаведных валютных крэдытаў пад будучыя таварныя пастаўкі. У выніку цана пытання — $6-6,5 млрд. Мы лічым, што гэтыя сродкі будуць садзейнічаць таму, каб сапраўды стабілізаваць сітуацыю на валютным рыку», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Паводле яго слоў, усе гэтыя пытанні рэальна вырашыць на працягу бліжэйшых месяцаў.

СТАР. 2

## ПАРЛАМЕНЦКІ СХОД САЮЗА БЕЛАРУСІ І РАСІІ ПРОЙДЗЕ 8 ЧЭРВЕНЯ Ў МІНСКУ

**Сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі пройдзе ў Мінску 8 чэрвеня. Пытанне аб яе правядзенні ўзгоднена ўчора на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімірам Андрэйчанкам, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

На сесіі будзе разгледжана справаздача Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы па выкананні бюджэту за 2009 год. Гэты бюджэт выкарыстаны ў памеры 4,8 млрд расійскіх рублёў. Таксама будзе разгледжана пытанне аб развіцці нарматыўна-прававой базы Саюзнай дзяржавы ў галіне абароны, правапарадку і бяспекі. Дэпутаты лічаць, што наспела неабходнасць у распрацоўцы новай Канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы. Ранейшая была распрацавана 12 гадоў таму, і ў святле сусветных змяненняў яна мае патрэбу ў карэкціроўцы. Новая Канцэпцыя бяспекі Саюзнай дзяржавы будзе распрацавана на падставе канцэпцый нацыянальнай бяспекі Беларусі і Расіі.

Яшчэ адно пытанне, якое плануецца разгледзець на Парламенцкім сходзе, — аб рэалізацыі Канцэпцыі сацыяльнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2010 года і Асноўных напрамках сацыяльнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2015 года.

У плане рэалізацыі Канцэпцыі да 2010 года шмат зроблена, у першую чаргу па ўраўноўванні правоў грамадзян Беларусі і Расіі, правоў на свабоду перамяшчэння, выбар месца жыхарства, месца знаходжання, вырашаны пытанні медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, пенсійнага забеспячэння, вырашаюцца пытанні ў галіне культуры, спорту, турызму. З мэтай замацавання і ўдасканалення дасягнутага распрацавана Канцэпцыя сацыяльнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2015 года.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны таксама аб ходзе восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў. Паводле слоў Уладзіміра Андрэйчанкі, сур'ёзная ўвага ўдзяляецца пытанням фарміравання Мытнага саюза, Адзінай эканамічнай прасторы. Палата прадстаўнікоў ратыфікавала практычна ўсе дакументы, якія фарміруюць дагаворна-прававую базу Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі.

Да другога чытання рыхтуецца Жыллёвы кодэкс Рэспублікі Беларусь, Закон аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб. Прэзідэнт даручыў звярнуць увагу на пытанні рэалізацыі Дырэктывы № 4. Цяпер сумесна з урадам вядзецца работа над законапраектамі па рэалізацыі Дырэктывы № 4 па стымуляванні прадпрымальніцтва. У прыватнасці, неабходна разгледзець амаль 22 законапраекты, у некаторыя з іх унесці змяненні і дапаўненні, распрацаваць новыя, напрыклад аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, процідзеянні манапалістычнай дзейнасці.

Таксама на сустрэчы абмеркаваны шэраг іншых пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы.



## Родныя з Родні

**Самая маладая шматдзетная маці ў вёсцы з незвычайнай назвай Родня — Яўгенія Шаршнёва. Працуючы на страусінай ферме мастаком-афарміцелем, Яўгенія размалёўвае яйкі экзатычных птушак для сувеніраў. Сын Яўген і дочкі Карына, Паліна і Аксана, нягледзячы на малы ўзрост, пераймаюць ад маці сакрэты яе майстэрства.**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

*Клімавіцкі раён.*

## ПЕНСІЯ — ЯШЧЭ НЕ КРОПКА

Сяргей ГРЫБ

**ВЯДОМЫ факт, што літаральна штомесяц выходзяць на пенсію тысячы беларусаў, — не больш чым статыстыка. Прычым часта за ёй хаваецца галоўнае. У абсалютнай большасці выпадкаў новы статус пенсіянера — гэта непрыемныя думкі аб змяншэнні даходаў. І адначасова гэта даволі моцны псіхалагічны стрэс.**

### РАЗМЕРКАВАННЕ АБАВЯЗКАЎ

Змена ладу жыцця заўсёды пераносіцца цяжка, але цяжка ўдвая — у немаладым узросце. Не сакрэт, што пасля выхаду на пенсію многія пачынаюць думаць, што «сапраўднае» жыццё закончылася.

— Напэўна, галоўная парада ў такой сітуацыі — не замыкацца ў сабе, — зазначае загадчык аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі Смаргонскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва «Цёплы дом» Юлія Шпакоўская. — А яшчэ надзвычай важна не губляць ранейшых сувязяў з сябрамі, знаёмымі, калегамі — нават калі чалавек пайшоў з працы з крыўдай.

Адначасова ні ў якім разе нельга забывацца на дзяцей і ўнукаў. Праўда, у гэтым выпадку неабходна памятаць: з'яўленне магчымасці аддаваць больш часу сям'і з вялікай доляй верагоднасці можа прывесці да абвастрэння вядомага «канфлікту пакаленняў». Аднак нічога незвычайнага тут няма.

— Каб пазбегнуць падобных канфліктаў, трэба перш-наперш сесці з дзецьмі і ўнукамі за своеасаблівы стол перамоў і дакладна вызначыць размеркаванне хатніх абавязкаў: хто з членаў сям'і будзе гатаваць сняданак і вячэру, хто — выкідваць смецце, хто — хадзіць у краму, а хто — плаціць за камунальныя паслугі, — працягвае Юлія Шпакоўская. — Прычым падчас размеркавання неабходна зыходзіць з таго, што ўсе ў сям'і роўныя, а таксама ўлічваць пажаданні, інтарэсы і магчымасці кожнага. Апроч таго, тут адразу ж вызначаецца, што дамоўленасці не змяняюцца. Адступіць ад сваіх абавязкаў можна толькі ў сапраўды крайнім выпадку — скажам, з прычыны хваробы.

Пры гэтым імкненне рабіць «усё за ўсіх» — адназначная памылка. «Ахвяраванне» сваімі інтарэсамі можа прывесці да таго, што добрыя намеры хутка перастануць заўважаць. У той жа час прыцягненне маладых да вырашэння хатніх праблем дазволіць дзецям і ўнукам адчуць сябе паўнавартаснымі членамі сям'і. І, адпаведна, павысіць іх адказнасць.

— Калі сітуацыя склалася так, што прыходзіцца жыць пад адным дахам з сям'ёй сваіх дзяцей, трэба навучыцца асабліваму цярпенню, — кажа Юлія Шпакоўская. — Непаразуменні здараюцца заўсёды. І тут нельга забывацца на залатое правіла: ніколі не перадаваць негатыўную інфармацыю ад нявесткі сыну ці наадварот. Таму, хто знаходзіцца пасярэдзіне, заўсёды дастаецца двайная порцыя агрэсіі. Вось чаму калі чуеце скаргі — іх трэба проста выслухаць. А рабіць заўвагі неабходна толькі ад уласнага імя.

### А ТАНЦАВАЦЬ — МАГЧЫМА І НА КРЭСЛЕ

На жаль, маладзей ніхто і ніколі не становіцца. А ўзрост — заўсёды дадатковыя праблемы са здароўем. Таму з'яўленне вольнага часу пасля выхаду на пенсію заўсёды трэба выкарыстаць для праходжання медыцынскіх аглядаў. Не менш актуальная тэма і харчаванне.

— Трэба імкнуцца абмежаваць спажыванне вэнджанага мяса і рыбы, перцу, гарчыцы і іншых спецый, — распавядае Юлія Шпакоўская. — І, зразумела, ні ў якім разе нельга забывацца на пачуццё меры. Скажам, не варта піць шмат вадкасці без адчування смагі — залішняя вадкасць не карысная для крыві, аслабляе арганізм і робіць яго няздольным супрацьстаяць інфекцыям. Тыя ж самаабмежаванні датычацца і ежы. Для пажылых людзей, з-за значнага зніжэння абмену рэчываў, лічыцца нармальным нават 2-разовае харчаванне. І садзіцца за стол лепш толькі тады, калі з'явілася адчуванне голаду.

Плюс да таго не варта грэбаваць фізічнымі практыкаваннямі. Зразумела, што займацца спортам дзеля дасягнення нейкіх вынікаў — не варыянт. Аднак ляжаць на канапе перад тэлевізарам — таксама.

Дарэчы, магчымасцяў для заняткаў спортам нямала. Часта тыя ж трэнажоры можна «адшукаць» нават у бліжэйшым клубе, ЖЭСе ці школе — практычна ўсе яны займаюцца аказаннем платных паслуг. І звычайна — па невысокіх тарыфах.

— Можна звярнуць увагу і на танцы — тыя ж вечарыны адпачынку для пажылых людзей, якія звычайна ладзяцца ва ўстановах культуры, — заўважае Юлія Шпакоўская. — Прычым калі з-за праблем з нагамі танцаваць у класічным разуменні цяжка, то можна паспрабаваць рабіць гэта... седзячы на крэсле. Скажам, пад павольную музыку проста ўзнімаць рукі ўгору і колападобнымі рухамі марудна «заграбаць» да сябе энергію звонку, рабіць павароты шыі, разводзіць рукі ўбок. Дарэчы, практыка «танцаў на крэслах» з'явілася ў нашым тэрытарыяльным цэнтры некалькі гадоў таму, і цяпер ужо можна сцвярджаць — пажылыя людзі, якія займаліся імі, сталі адчуваць нашмат менш праблем з суставамі і пазваночнікам.

### АД АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ ДА КАМП'ЮТАРА

Вольны час — гэта і праблема адпачынку. Абмяжоўвацца выключна хатнімі справамі насамрэч не варта, час ад часу нялішне разнастаіць жыццё паходам у тэатр ці экскурсіяй. А яшчэ лепш — заняцца адукацыяй, асвоіць тое, да чаго некалі «не дайшлі рукі».

СТАР. 2

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**20 мая 2011 г. у 15.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца чарговае пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

**ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»**

С 18 мая 2011 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.05.2011 № 172 размер ставки рефинансирования установлен в размере 14 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 1 процентный пункт с 18.05.2011.

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136**
Время работы Контакт-центра Банка: 8.00–20.00 в будние дни;
8.00–18.00 в выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

*ОАО «Белагропромбанк». Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 № 2. УНП 100693551*

**БЕЛАРУСБАНК**

**ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает, что с 23 мая 2011 года изменяется размер вознаграждений, взимаемых за снятие с использованием международных пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» наличных денежных средств в других банках и в банкоматах других банков.**

**Обслуживание международных банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» MasterCard Gold, Visa Gold:**

| Наименование операции | MasterCard Gold, Visa Gold (мультивалютные) | | | MasterCard Gold, Visa Gold |
|---|---|---|---|---|
| | Счет в долларах США | Счет в евро | Счет в бел. руб. | Счет в бел. руб. |
| Снятие наличных денежных средств, % от суммы: | | | | |
| в других банках (без учета вознаграждения других банков) | 3 (мин. 7 долларов США) | 3 (мин. 5 евро) | 3 (мин. 30000 бел. руб.) | 3 (мин. 30000 бел. руб.) |
| в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков) | 2 (мин. 3 доллара США) | 2 (мин. 2 евро) | 2 (мин. 15000 бел. руб.) | 2 (мин. 15000 бел. руб.) |

**Обслуживание международных банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» MasterCard (Standard, Business), VISA Classic:**

| Наименование операции | MasterCard Standard, Visa Classic (мультивалютные) | | | MasterCard Standard, Visa Classic | MasterCard Business (мультивалютные) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Счет в долларах США | Счет в евро | Счет в бел. руб. | Счет в бел. руб. | Счет в долларах США | Счет в евро | Счет в бел. руб. |
| Снятие наличных денежных средств, % от суммы: | | | | | | | |
| в других банках (без учета вознаграждения других банков) | 3 (мин. 7 долларов США) | 3 (мин. 5 евро) | 3 (мин. 30000 бел. руб) | 3 (мин. 30000 бел. руб.) | 3 (мин. 7 долларов США) | 3 (мин. 5 евро) | 3 (мин. 30000 бел. руб.) |
| в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков) | 2 (мин. 3 доллара США) | 2 (мин. 2 евро) | 2 (мин. 15000 бел. руб) | 2 (мин. 15000 бел. руб.) | 2 (мин. 3 доллара США) | 2 (мин. 2 евро) | 2 (мин. 15000 бел. руб.) |

**Обслуживание международных банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» Maestro, VISA Electron (мультивалютные):**

| Наименование операции | Maestro, Visa Electron | | |
|---|---|---|---|
| | Счет в долларах США | Счет в евро | Счет в бел. руб. |
| Снятие наличных денежных средств, % от суммы: | | | |
| в других банках (без учета вознаграждения других банков) | 3 (мин. 7 долларов США) | 3 (мин. 5 евро) | 3 (мин. 30000 бел. руб.) |
| в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков) | 2 (мин. 3 доллара США) | 2 (мин. 2 евро) | 2 (мин. 15000 бел. руб.) |

**Обслуживание международных банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» VISA Electron со счетом в белорусских рублях:**

| Наименование операции | Микропроцессорная карточка VISA Electron стандарта EMV, микропроцессорная карточка VISA Electron стандарта EMV для женщин (Леди Карт) | Карточка VISA Electron с магнитной полосой для женщин (Леди Карт) |
|---|---|---|
| Снятие наличных денежных средств, % от суммы: | | |
| в других банках (без учета вознаграждения других банков) | 3 (мин. 30000 бел. руб.) | 3 (мин. 30000 бел. руб.) |
| в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков) | 2 (мин. 15000 бел. руб.) | 2 (мин. 15000 бел. руб.) |

**Обслуживание международных микропроцессорных банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» VISA Electron стандарта EMV «Сберегательная» (со счетом в долларах США):**

| Наименование операции | Микропроцессорная карточка VISA Electron стандарта EMV «Сберегательная» |
|---|---|
| Снятие наличных денежных средств, % от суммы: | |
| в других банках (без учета вознаграждения других банков) | 3 (мин. 7 долларов США) |
| в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков) | 2 (мин. 3 доллара США) |

**Дополнительная информация – по телефону Контакт-центра 147 (звонок бесплатный, доступен со стационарного телефона).**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ІРЛАНДЫІ ПЕРАД ПРЫЕЗДАМ ЛІЗАВЕТЫ ІІ АБЯСШКОДЗІЛІ БОМБУ




**У аўторак пачаўся гістарычны візіт каралевы Лізаветы ІІ у Ірландыю — першы візіт брытанскага манарха ў гэтую краіну за апошнія 100 гадоў.**

У панядзелак увечар у графстве Кілдэр на борце аўтобуса, што накіроўваўся ў сталіцу Ірландыі Дублін, была выяўлена бомба. Сапёры ірландскай арміі абясшкодзілі бомбу, а пасажыры дабраліся да Дубліна на іншым аўтобусе.

Супраць візіту каралевы ў Ірландскую Рэспубліку выступаюць прыхільнікі «Сапраўднай ірландскай рэспубліканскай арміі» (Real IRA), якія жадаюць уз'яднання Ірландыі і Паўночнай Ірландыі. Групоўка абвінаваціла каралеву ў «ваенных злачынствах» і заявіла, што кіраўніка брытанскай дзяржавы не жадаюць бачыць на ірландскай зямлі.

### ГЛАБАЛЬНЫ КРЫЗІС: ДЫСКРЫМІНАЦЫІ Ў СФЕРЫ ПРАЦЫ СТАНЕ БОЛЬШ

**Глабальны эканамічны і сацыяльны крызіс прывёў да ўзрастання верагоднасці дыскрымінацыі ў дачыненні пэўных груп працаўнікоў. Пра гэта гаворыцца ў новым даследаванні Міжнароднага бюро працы (МБТ).**

«У органы, якія займаюцца пытаннямі раўнапраўя, паступае ўсё больш скаргаў, што паказваюць на тое, што дыскрымінацыя на працоўным месцы прымае больш разнастайныя формы, а дыскрымінацыя па некалькіх прыкметах становіцца хутчэй правілам, чым выключэннем», сцвярджаюць аўтары справаздачы. У вобласці прасоўвання гендарнай роўнасці ў сферы працы ў апошнія дзесяцігоддзі быў дасягнуты значны прагрэс. Тым не менш паміж жанчынамі і мужчынамі па-ранейшаму існуе адрозненне ў аплаце працы: зарплата першых складае ў сярэднім 70-90% ад заработнай платы другіх. Нягледзячы на паступовае ўкараненне гнуткага графіка працы як элемента мер, накіраваных на стварэнне ўмоў для выканання працаўнікамі сямейных абавязкаў, дыскрымінацыя ў дачыненні цяжарных і маладых маці ўсё яшчэ застаецца вельмі распаўсюджанай з'явай.

Значную праблему ўяўляюць сэксуальныя дамаганні на працоўным месцы. Найменш абароненымі ў гэтым плане з'яўляюцца маладыя фінансава залежныя, незамужнія і разведзеныя жанчыны, а таксама мігранты. Сярод мужчын аб'ектамі сэксуальных дамаганняў звычайна становяцца маладыя людзі, гомасэксуалісты і прадстаўнікі этнічных і нацыянальных меншасцяў. З паўсюднай дыскрымінацыяй пры прыёме на працу сутыкаюцца працаўнікі-мігранты.

У сферы працы захоўваецца дыскрымінацыя і ў дачыненні людзей з абмежаванымі магчымасцямі, пра што сведчыць нізкі ўзровень занятасці сярод гэтай катэгорыі працаўнікоў, колькасць якой ва ўсім свеце складае 650 млн чалавек. Каля 64% апытаных у краінах Еўрасаюза мяркуюць, што на рынку працы эканамічны крызіс прывядзе да ўзмацнення дыскрымінацыі па прыкмеце ўзросту. У некаторых развітых краінах актуальнае значэнне набывае дыскрымінацыя па прыкмеце ладу жыцця, асабліва ў тым, што датычыцца курэння і залішняй масы цела.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Аукцион состоится 21.06.2011 г. в 10.30 по адресу: 220088, г. Минск, ул. Захарова, 57, каб. № 415. Организатором аукциона является РУП «Белтелком» в лице Минского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Минск, ул. Захарова, 57.**

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Отдельные помещения со вспомогательными помещениями на 1-м и 2-м этажах в капитальном строении (здание специализированное связи) общей площадью 260,7 кв. м (на 1-м этаже: 76,1; 8,2; 7,9; 17,3; 6,2; 4,1; 19,9; 4,9; на 2-м этаже: 12,4; 16,9; 13,2; 10,4; 8,5; 11,7; 4,7; 1,6; 14,4; 20,4; 1,9) по ул. Тутаринова, д. 1 в г. Слуцке Минской области; удовлетворительного состояния, срок аренды — 3 года; начальная цена продажи — 2 281 125 рублей; размер задатка — 228 110 рублей; коэффициент от 0,5 до 3,0 — **3,0**; целевое использование — для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Документы на участие в аукционе принимаются **с 20.05.2011 г. по 20.06.2011 г.** в рабочее время (с 9.00 до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. Слесарная, 18, каб. 5, 6. Документы, поданные после 16.00 20.06.2011 г., не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефон для справок: (017) 500 14 64, 500 12 48, факс (017) 500 14 78.**

УНП 102302863

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.05.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША ... 3 130,00 | 1 чэшская крона ... 180,83 |
| ▲ 1 еўра ... 4 430,20 | 1 польскі злоты ... 1 126,06 |
| 1 латвійскі лат ... 6 241,90 | ▲ 1 расійскі рубель ... 111,32 |
| 1 літоўскі літ ... 1 282,24 | 1 украінская грыўня ... 391,86 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 28,1177 |
| 10 UAH | 35,2021 |
| 10000 BYR | 90,0920 |
| EUR | 39,8512 |

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
МАЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 16 (15667)

# У ШКОЛУ — ПА ЗАРПЛАТУ

**Канікулы — перш-наперш адпачынак. Але адначасова гэта і час, калі традыцыйна з'яўляюцца дадатковыя магчымасці падзарабіць. У прыватнасці, як паведаміла галоўны спецыяліст аддзела арганізацыі працы па садзейнічанні занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Людміла АТРАШКОВА, чакаецца, што сёлета на працягу чэрвеня-жніўня змогуць папрацаваць не менш чым 3 тысячы няпоўнагадовых мінчан, старэйшых за 14 гадоў.**

Пашукаць магчымасці для летніх падпрацовак заўсёды можна самастойна. Аднак тут ёсць і іншы варыянт — звярнуцца да сацыяльнага педагога ў сваёй жа школе або ў аддзел па працаўладкаванні па месцы жыхарства.

— Традыцыйна лета — перыяд падрыхтоўкі да новага навучальнага года, — зазначае Людміла Атрашкова. — А адсюль і павелічэнне аб'ёмаў работ. Таму падчас наступных канікулаў у многіх з'явіцца магчымасць папрацаваць у сваіх жа школах — заняцца дробнымі рамонтамі, добраўпарадкаваннем і азеляненнем прылеглых тэрыторый, аднаўленнем кніг і інвентару. Плюс да таго, часовая занятасць будзе наладжана ў шэрагу ўстаноў пазашкольнай працы — тут будзе магчымасць заняцца вырабам мяккіх цацак, самых розных сувеніраў.

І ўсё гэта — за рэальную зарплату. Прычым яе памер не можа быць ніжэйшым за паказчык мінімальнай пагадзіннай аплаты, які на сёння складае 2710 рублёў.

— Апроч таго, з кожным падлеткам у абавязковым парадку заключаецца працоўны дагавор, — працягвае Людміла Атрашкова. — На кожнага, хто ўладкоўваецца больш чым на пяць дзён, заводзіцца працоўная кніжка. А хлопцам і дзяўчатам, якія маюць пашпарт, адкрываецца індывідуальны асабісты рахунак у Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва і выдаецца пасведчанне дзяржаўнага сацыяльнага страхавання — часовая занятасць у вольны ад навучання час будзе залічаная ў стаж.

Аднак у працы няпоўнагадовых ёсць свае асаблівасці. Так, заканадаўства вызначае, што грамадзян ва ўзросце да 18 гадоў катэгарычна забараняецца прыцягваць да звышурочных работ, працы ўначы, у выхадныя і святочныя дні. Асоб да 18 гадоў ні ў якім разе нельга выкарыстоўваць на работах з цяжкімі і небяспечнымі ўмовамі, на вахтавых работах і работах, звязаных з вытворчасцю, захоўваннем і гандлем спіртных напояў, для няпоўнагадовых прадугледжаны абмежаванні па перасоўванні цяжараў. Існуюць канкрэтныя ліміты і на працягласць: падчас летніх канікулаў працоўны дзень для падлеткаў ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў не можа перавышаць 7 гадзін, а для падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — 4 гадзін 36 хвілін.

— Непасрэдна для ўладкавання спатрэбіцца падаць некаторыя дакументы, — адзначае Людміла Атрашкова. — Гаворка пра заяву аб прыёме на працу, медыцынскую даведку пэўнага ўзору, копіі пашпарта ці пасведчання аб нараджэнні. А падлеткам ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў неабходна таксама прынесці пісьмовую заяву аднаго з бацькоў, усынаўляльніка ці папячыцеля — з пацвярджэннем згоды на працу.

Можа атрымацца так, што колькасць месцаў для працы акажацца меншай за колькасць няпоўнагадовых, якія пажадаюць папрацаваць. У такім разе трэба мець на ўвазе: першачарговым правам на часовае ўладкаванне карыстаюцца сіроты, моладзь з сем'яў беспрацоўных грамадзян, няпоўных, шматдзетных і «цяжкіх» сем'яў, а таксама маладыя людзі, якія знаходзяцца на ўліку ў камісіях па справах няпоўнагадовых. І, дарэчы, практыка сведчыць: менавіта на гэтыя катэгорыі падлеткаў прыпадае каля 70 працэнтаў ад агульнай колькасці выпадкаў прыёму на працу ўлетку.

— Разам з тым, калі магчымасць для працы ёсць, то карыстацца ёй можна на працягу ці не ўсіх канікулаў, — заўважае Людміла Атрашкова. — Сапраўды, вызначана: максімальны тэрмін працоўнага дагавора з маладым чалавекам ва ўзросце больш за 14 гадоў абмежаваны двума месяцамі. Аднак затым пасля абавязковага перапынку ў 7 дзён існуе варыянт заключэння працоўнага дагавора паўторна.

**Сяргей ГРЫБ.**

Абітурыент—2011

# Белдзяржуніверсітэт запрасіў на прагулку па факультэцкім праспекце...






У передапошні дзень кастрычніка Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт адзначыць сваё 90-годдзе. Менавіта таму дэвізам сёлетняй прыёмнай кампаніі, якая стартуе ў БДУ літаральна праз месяц, быў абраны слоган «Стань студэнтам БДУ ў юбілейны год!». Відаць па ўсім, кіраўніцтва БДУ зусім не засмучае дэмаграфічная сітуацыя ў краіне і скарачэнне колькасці прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. Прынамсі, план прыёму на першы курс ва ўніверсітэце застаўся на ўзроўні папярэдняга года. А каб патэнцыйны абітурыент не памыліўся з прафесійным выбарам і прыйшоў вучыцца менавіта ў БДУ, тут вырашылі пайсці нестандартным шляхам — не проста правесці традыцыйны Дзень адчыненых дзвярэй, а арганізаваць сапраўдны Фестываль факультэтаў, які прэтэндуе стаць штогадовым. Два дні запар ва ўніверсітэцкім дворыку праходзіла інтэрактыўнае прафарыентацыйнае мерапрыемства, удзел у якім маглі ўзяць як будучыя выпускнікі, так і ўсе ахвотныя, у тым ліку і гараджане, якія выпадкова праходзілі міма. Трэба прызнаць, што прайсці міма было даволі праблематычна, бо ў небе лунаў ярка-зялёны паветраны шар з запрашэннем на Фестываль факультэтаў. Ва ўсіх, хто апынуўся побач, тут жа зашчоўкалі фотакамеры ў мабільных тэлефонах...

Старт святу ў першы дзень дало шэсце дэканаў факультэтаў у мантыях і выступленне кіраўнікоў Белдзяржуніверсітэта. Кожны факультэт ладзіў сваю прэзентацыю і спрабаваў заманіць абітурыентаў менавіта да сябе. Тут былі і хімічныя доследы, і аказанне першай медыцынскай дапамогі на спецыяльным манекене, і магчымасць паглядзець удзень на зорнае неба ў тэлескоп. Крыху «падмачыла» святочны настрой халодная і дажджлівая субота, якая прымусіла ўсіх перабрацца з вуліцы пад дах галоўнага корпуса. Аднак ніхто, хто прыйшоў у гэты дзень у Белдзяржуніверсітэт, таксама не пашкадаваў, бо для здзяйснення асэнсаванага выбару было прапанавана максімум інфармацыі. Усяго сёлета на дзённую бюджэтную форму навучання ў БДУ плануецца набраць каля 2100 чалавек і 2700 чалавек — на дзённую платную форму навучання. На завочнай форме навучання за кошт сродкаў бюджэту будуць навучацца 420 чалавек і 1290 чалавек — за ўласныя сродкі.

З 2011 года Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт адкрывае прыём на тры новыя спецыяльнасці і некалькі новых напрамкаў. На біялагічным факультэце адкрываюцца спецыяльнасці «Мікрабіялогія» (з прысваеннем кваліфікацыі «Біёлаг. Мікрабіёлаг») і «Біяхімія» (з прысваеннем кваліфікацыі «Біёлаг. Біяхімік»).

У Інстытуце бізнэсу і менеджменту тэхналогій БДУ адкрыецца спецыяльнасць «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» з прысваеннем кваліфікацыі «Менеджар-эканаміст інфармацыйных сістэм». На спецыяльнасці «Фізіка» — новы напрамак «Фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій» з прысваеннем кваліфікацыі «Фізік. Інжынер»; на спецыяльнасці «Геаграфія» — напрамак «Космааэракартаграфія» з прысваеннем кваліфікацыі «Географ. Картограф».

З'явяцца і два новыя напрамкі падрыхтоўкі спецыялістаў на філалагічным факультэце.

На спецыяльнасцях «Руская філалогія» і «Беларуская філалогія» раней былі адкрыты такія напрамкі, як «Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць» і «Камп'ютарнае забеспячэнне», а цяпер з'явіцца і яшчэ адзін новы напрамак — «Дзелавая камунікацыя». Выпускнікам будзе прысвойвацца кваліфікацыя «Філолаг. Выкладчык беларускай (або рускай) мовы і літаратуры. Спецыяліст па дзелавой камунікацыі». Да таго ж у рамках «Рускай філалогіі» з'явіцца новы напрамак «Руская мова як замежная», дзе будуць рыхтаваць выкладчыкаў для работы з замежнымі грамадзянамі, якія маюць намер навучацца ў Беларусі. Размеркаванне па напрамках падрыхтоўкі будзе ажыццяўляцца толькі пасля заканчэння другога курса.

А на гуманітарным факультэце БДУ ў рамках спецыяльнасці «сацыяльная работа» адкрыецца новы напрамак «сацыяльнае праектаванне» з прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «Спецыяліст па сацыяльнай рабоце і кіраванню праектамі».

На сёння гэта першая і пакуль адзіная ў Беларусі праграма падрыхтоўкі прафесіяналаў у гэтай галіне. У ВНУ навучанне студэнтаў будзе весціся па агульнаадукацыйных, медыцынскіх,сацыяльных, псіхалагічных і праектных дысцыплінах. Мяркуецца, што выпускнікі будуць запатрабаваныя ў ведамствах і міністэрствах, медыцынскіх і адукацыйных установах, ды і ўвогуле ў любых арганізацыях, якім патрабуецца інфармацыйная, кансультатыўная і экспертная падтрымка па кіраванні сацыяльнымі праектамі і праграмамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

## Супраць СНІДу

# Марафон-памяць — у сямі гарадах

**У панядзелак стартаваў Рэспубліканскі моладзевы аўтамарафон, прысвечаны Сусветнаму Дню памяці загінулых ад СНІДу (праводзіцца ў трэцюю нядзелю мая). Па маршруце аўтамарафону да 20 мая плануецца наведванне сямі гарадоў — Мінска, Жыровіч, Баранавіч, Салігорска, Светлагорска, Магілёва і Оршы.**

Ініцыятарамі падзеі выступаюць Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА, Міжнародная сетка Y-PEER у Беларусі, Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. З дня старту маладыя ўдзельнікі аўтамарафону пачнуць ствараць рэзалюцыю «Моладзь будучыні», кожны наступны абзац якой будзе нараджацца ў новым горадзе, а дакладней, свежымі сіламі навучэнцаў Мінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа гандлю, Жыровіцкага аграрна-тэхнічнага каледжа, Баранавіцкага каледжа лёгкай прамысловасці імя В.Я. Чарнышова, Салігорскага прафесійна-тэхнічнага каледжа, Светлагорскага індустрыяльнага каледжа, Магілёўскага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа, Аршанскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча №110 будаўнікоў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Каб «жалязяка» не аказалася «бомбай»

На Віцебшчыне па суботах плануюць аднавіць факультатыўныя заняткі ў школах па дапрызыўнай падрыхтоўцы. Таксама будуць адчыняць ціры, якія калісьці зачыніліся з-за нерэнтабельнасці, пабудуюць і новыя. Школьнікаў таксама навучаць, як не стаць ахвярай выбуховых рэчываў.

Замена сістэмы пачатковай ваеннай падрыхтоўкі на дапрызыўную ў 1990-я гады было не самым рацыянальным рашэннем», — такую думку выказаў журналістам **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ.** — Раней ва ўсіх класах былі зусім іншыя ўмовы для падрыхтоўкі, у тым ліку і вучэбныя дапаможнікі: муляжы, макеты. І на занятках дзеці маглі навучыцца пэўным правілам паводзін, каб не страціць здароўе і не, дай Бог, жыццё, бо ім тлумачылі, што нельга разбіраць незнаёмыя «жалязякі».

Дарэчы, наконт інвентарызацыйнай працы ў навучальных і іншых установах, якая цяпер праводзіцца дзеля выяўлення і канфіскацыі небяспечных «прадметаў» Як адзначыў губернатар, толькі ў мінулым годзе больш чым у 120 школах вобласці была выяўлена і канфіскавана вялікая колькасць такіх «вучэбных дапаможнікаў». Пра які ўзровень падрыхтоўкі можна гаварыць, калі той жа аўтамат Калашнікава вывучаецца толькі па кніжках? А як ажыццяўляецца зборка-разборка гэтай зброі, будучыя абаронцы краіны проста не ведаць.

«Дзеці павінны мець уяўленне пра тое ж выбуховае прыстасаванне, снарад. Ім павінны быць прадэманстраваны імітацыйныя прадметы, муляжы, каб дзеці бачылі што ўяўляюць сабой боепрыпасы і якую небяспеку яны ўяўляюць», — падзяліўся думкамі губернатар. — Дарэчы, некалькі тыдняў таму ў Лёзненскім раёне загінуў 11-гадовы хлопчык, які паказваў дарослым нейкі металічны прадмет, а яны палічылі, што гэта нейкая «жалязяка». А на самай справе — снарад нямецкага паходжання. Некалькі разоў хлопчык ударыў снарадам аб асфальт, адбыўся выбух, і ён загінуў. Параненыя былі ягоная сястрычка і яшчэ двое дзяцей».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НЕ ВЕДАЕЦЕ, ХТО ТАКІ ФАЦІН? ТАДЫ МЫ ІДЗЁМ ДА ВАС!

**Магілёўскія школьнікі праводзяць асветніцкую акцыю, прымеркаваную да 70-годдзя гераічнай абароны горада.**

Калі вы жывяце на вуліцах Раманава, Фаціна, Лазарэнкі і не ведаеце дакладна, кім былі гэтыя людзі, тады да вас прыйдуць з аўтарытэтным тлумачэннем дзеці.

Вучні школ і гімназій абласнога цэнтра вырашылі расказаць пра герояў 1941 года, імёнамі якіх названы вуліцы абласнога цэнтра. Увогуле такіх вуліц у Магілёве каля паўсотні. Маладыя энтузіясты распаўсюджваюць сярод жыхароў лістоўкі з адпаведнай інфармацыяй, гутараць з людзьмі. Настаўнікі падтрымліваюць іх, бо такая асветніцкая праца — самы сапраўдны ўрок гісторыі, карысны для ўсіх.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ТАМУ ШТО НАМ ТАК ЗАХАЦЕЛАСЯ...

**«U-LIFE».** Менавіта так гучыць назва новага музычнага праекта, які зусім нядаўна з'явіўся на хвалях сучаснага шоу-бізнэсу. У яго аснову пакладзена ідэя ўзаемасувязі моды і музыкі. Менавіта яны пераплятаюцца паміж сабой і такім чынам надаюць яму своеасаблівасць, паколькі ў нашай краіне нічога падобнага яшчэ не было. Тры хлопцы — Іван Ігнатовіч, Раман Трушко і Аляксей Конах, якія з дзяцінства займаюцца творчасцю, сустрэліся і стварылі «U-LIFE».

## З ЧАГО ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ

**— Дзе вы знайшлі адзін аднаго?**

**Іван**: Усё пачалося ў Францыі, а менавіта з Парыжа. Мы сустрэліся на адным з модных паказаў. Гэта была такая своеасаблівая модная вечарына, на якой я выступаў у якасці мадэлі, паколькі прафесійна займаюся мадэльным бізнэсам, праўда, у асноўным за мяжой. А вось Рома і Лёша там прысутнічалі як танцоры. Яны адкрывалі паказ сваім шыкоўным танцавальным нумарам. Была відаць рука прафесіяналаў, творчая задума і наогул цікавы своеасаблівы падыход да працы. Мы адразу адзначылі адзін аднаго. І на працягу ўсяго нашага знаходжання ў Парыжы неяк так атрымлівалася, што мы перыядычна сустракаліся на розных модных вечарынах, тусоўках, паказах. Мы пазнаёміліся. Якой радасцю для нас было даведацца, што ўсе мы беларусы! Вядома, нам было аб чым пагаварыць, калі ўлічваць, што ўсе мы — творчыя асобы.

**— Дык менавіта там нарадзілася ідэя стварэння агульнага праекта?**

**Іван:** Не. Што самае цікавае. Скончыўся час нашага знаходжання ў Парыжы і ўсе разляцеліся хто куды, кожны па сваіх справах. Мы нават і нумарамі тэлефонаў не паспелі абмяняцца. Я вярнуўся ў Маскву, дзе ўжо даўно супрацоўнічаю з адным вядомым мадэльным агенцтвам, а хлопцы вярнуліся ў Беларусь, як я потым ужо даведаўся.

**Аляксей:** Так, мы неяк імкліва раз'язджаліся, што нават і тэлефонамі не паспелі абмяняцца. Спадзяваліся на інтэрнэт, розныя камунікацыйныя сеткі, дзе можна знайсці каго заўгодна.

**Раман**: І ў выніку сустрэліся ў Мінску. Вось гэта на самай справе цікава.

**— Як так?**

**Іван**: Сустрэліся мы на самай справе ў Мінску, на «Млыне моды», куды нас запрасілі ў якасці гасцей. Гэта было даволі прыемным сюрпрызам. Менавіта тут мы размаўлялі з многімі творчымі людзьмі, якія, мабыць, іददалі нам упэўненасці на стварэнне агульнага праекта. На «Млыне» я бываю штогод, выступаю ў якасці мадэлі і стараюся сачыць за змяненнямі модных тэндэнцый. Хачу адзначыць, што ўзровень беларускай моды значна ўзрос за апошнія гады. Шмат цікавых калекцый можна бачыць на гэтым конкурсе. У гэтым годзе мы выступалі на «Млыне моды» ў якасці гасцей на паказе калекцыі Ганны Драгацэннай. Працу гэтага дызайнера можна адзначыць асабліва, паколькі ў яе заўсёды столькі свежых і незвычайных ідэй. Ды і сама яна чалавек цікавы.

## АБ ПРАЕКЦЕ

**— А чаму менавіта такі праект? Што вы хочаце пры яго дапамозе данесці да гледача, слухача?**

**«U-LIFE»:** У яго аснову мы заклалі ўзаемасувязь моды і музыкі, паколькі два гэтыя кірункі, на наш погляд, неразрыўна звязаныя. А ў нашай краіне, наколькі нам вядома, такога проекта яшчэ няма.

**Іван**: Ды і вопыт працы ў гэтых сферах у нас даволі вялікі. Таму мы можам карыстацца сваімі рэальнымі ведамі, што толькі дапамагае нам. Я шмат дэфіліраваў, удзельнічаў у многіх паказах. Яшчэ ў прыдачу з дзяцінства займаюся вакалам. А хлопцы — майстры сваёй справы ў плане танцаў.

**Раман**: Такая ідэя нас адразу зачапіла ўсіх. Цікава стала. І не толькі таму што мы будзем танцаваць у новым праекце, але і з-за навізны самой ідэі.

**Аляксей**: Мы бывалі ў розных краінах, наведвалі шматлікія мерапрыемствы, звязаныя і з модай, і з музыкай. У нас такім чынам была магчымасць бачыць узровень творчага развіцця і адначасова параўноўваць яго з нашым. І, ведаеце, адразу ўзнікла пытанне: «А чым мы горшыя?». У нашай краіне таксама ёсць творчыя людзі, якія ацэняць з годнасцю наш праект, і ім на самой справе будзе цікава. Нам хацелася ўнесці сваю лепту ў развіццё творчага працэсу на Беларусі. Перамагчы, такім чынам, у нашай краіне і на эстрадзе боязь да нечага новага.

## ПРА ЭСТРАДУ

**— Як лічыце, чаго не хапае нашай эстрадзе?**

**«U-LIFE»:** У нас не робяць шоу. Няма вялікіх праектаў, якія б захапілі амаль кожнага. Людзі аддаюць перавагу замежнай музыцы. А ў нас таксама шмат таленавітых людзей. І іх песні таксама можна слухаць. Толькі падаць гэты талент могуць не ўсе. Гэта наша асноўная праблема.

**— А што вы прапануеце аўдыторыі?**

**Іван**: Я пішу песні для нашага калектыву. Адну з іх зараз можна чуць на радыё. Я стараюся выкарыстоўваць актуальную, на мой погляд, на сённяшні дзень тэму адносін паміж людзьмі. Не каханне, як гэта можа падацца адразу. А тое, як людзі ў сучасным грамадстве выкарыстоўваюць адно аднаго дзеля выгады. Я спрабую пры дапамозе сваіх песень звярнуць увагу на гэтую праблему.

**Аляксей**: Калі мы пачулі песню, з якой Ваня выступаў у Парыжы на паказе, то адразу зразумелі, што гэта даволі цікава.

**Раман**: Справа ў тым, што гэта не проста, кажучы сучаснай мовай, папса. А ў даволі цікавай апрацоўцы, з добрым гукам. Гэтую мелодыю прыемна проста слухаць, і адначасова хочацца падтанцоўваць пад яе.

**— А чаму менавіта «U-LIFE»? Цікавая назва.**

**Іван**: Таму што мне так захацелася. Гэта жыццё. Інакш нельга. Я бачу яго з адваротнага боку і хацеў бы, каб і астатнія паспрабавалі зрабіць тое ж самае.

**— У вас, мабыць, ёсць спонсар? Зараз без яго, асабліва ў сферы шоу-бізнэсу, нікуды.**

**«U-LIFE»:** Пакуль што няма. Спрабуем і робім усё сваімі сіламі. Але над пошукамі гэтага самага спонсара мы зараз працуем *(усміхаюцца).*

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# НЕДЗІЦЯЧЫЯ ПРАБЛЕМЫ

## Як уздзейнічаць на падлеткаў, якія парушылі закон, і засцерагчы ад гэтага астатніх

Дзецьмі цалкам натуральна захапляцца. Кожны чых маленькага анёлка выклікае ў дарослых замілаванне. Абы яно не ператварылася ва ўсёдазволенасць. Малы кідаецца на падлогу і тупае нагамі, адмаўляючыся выходзіць з крамы, — Масік стаміўся. Запіс у школьным дзённіку «Біў суседку пеналам па галаве» — Масік свавольнічае. Як улавіць тую грань паміж «не», якое абмяжоўвае дзіця, і пастаянным патураннем? Справа нялёгкая, але ж нехта павінен яе рабіць. Інакш пачынаецца: «Дзіця не слухаецца, што я магу з ім зрабіць?!». А там не паспееш і вокам міргнуць, як Масік нагарэзнічаўся да таго, што яму ўжо адна дарога — у спецыяльную ўстанову.

Праблемы цяжкіх падлеткаў абмяркавалі днямі на выязным семінары ў Магілёўскай вобласці заканадаўцы з праваахоўнікамі ды спецыялістамі ў адукацыі. Вынікам дыскусіі могуць стаць канкрэтныя нормы права. Напрыклад, падлеткаў змогуць адпраўляць у спецустановы не толькі за крымінальныя, але і сістэматычныя адміністрацыйныя парушэнні. Такія заканадаўчыя папраўкі дэпутаты падтрымалі ўжо ў першым чытанні. Непаўналетнім таксама могуць забараніць з'яўляцца на дварэ ў начны час. Адпаведны законапраект сёлета паступіць у парламент. Ідэі наконт забароны на продаж алкаголю маладзейшым за 21 год і праверкі школьнікаў на ўжыванне наркотыкаў пакуль не матэрыялізаваліся ў выглядзе дакументаў, аднак на ўзроўні ініцыятыў агучаныя. Таму не выключана, што іх рэалізацыя таксама не за гарамі.

Калі паглядзець на агульную структуру злачыннасці, то «ўнёсак» непаўналетніх «заважыць» на 5,3 адсотка. Летась 27 тыс. падлеткаў пераступілі закон, прыводзіць бязрадасную статыстыку **міністр унутраных спраў Анатоль КУЛЯШОЎ.** Прыкмячаюць праваахоўнікі і адметнасці падлеткавай злачыннасці.

### Спіртное 21-гадовай вытрымкі

Асаблівую ўвагу звяртае міністр на падлеткавае п'янства. Паводле яго звестак, кожны чацвёрты непаўналетні парушальнік здзейсніў злачынства ў стане алкагольнага ап'янення. Многія лічаць, што палепшыць сітуацыю можна, забараніўшы набываць алкаголь да 21 года. Некаторыя дэпутаты, дарэчы, ужо не першы год рухаюць гэтую прапанову і агучваюць яе ў розных аўдыторыях. І, здаецца, падзейнічала.

— Адпаведную ініцыятыву мы ўжо ўнеслі, — паведаміў міністр, адказваючы на пытанне дэпутата Ігара Спільнічэнкі. — Прапануем забараніць продаж спіртных напояў асобам да 21 года.

Ці пойдзе гэта на карысць? Тэма, бадай, асобнай дыскусіі. Мая сяброўка са Злучаных Штатаў (дзе падобныя абмежаванні практыкуюцца ўжо даўно) кажа, што там, 21-га дня нараджэння чакаюць як манны нябеснай. І пасля доўгага ўстрымання, дачакаўшыся нарэшце, напіваюцца да паўсмерці... Калі кажуць «не», як вядома, хочацца ўдвайне.

### А раптам наркотыкі?

Алкагалізацыя моладзі пастаянна бічуецца дзяржаўнымі дзеячамі. А ці ёсць падставы турбавацца пра наркатызацыю? Вунь у Расіі збіраюцца правяраць школьнікаў. Ці не прыспеў час Беларусі пераняць гэты вопыт, цікавіліся дэпутаты ў міністра ўнутраных спраў.

— Я хацеў бы ў нашай краіне ўвесці такую практыку, — падзяліўся сваімі поглядамі А. Куляшоў. — Маё меркаванне такое: не трэба тут вылучаць — гэтага будзем глядзець, гэтага не. Усе павінны раптоўна здаць тэст на кантроль магчымага спажывання наркатычнага рэчыва. Трэба зрабіць так, каб гэта не ператварылася ў нейкую разавую акцыю. Трэба праводзіць работу так, каб ад яе быў вынік, каб гэты страх у школьнікаў быў. Гэта будзе фактарам, які стрымлівае.

Наркатызацыю насельніцтва міністр схільны называць эпідэміяй 21 стагоддзя. Ён спасылаецца на ацэнкі сусветных экспертаў, паводле якіх адзін наркаман залучае да ўжывання яшчэ як мінімум 10 чалавек.

— Афіцыйна на ўліку ў нас знаходзіцца каля 65 тыс. чалавек. Памножце гэтую лічбу сціпла хоць бы на 10, — даводзіць міністр, маючы на ўвазе, што маштабы праблемы сур'ёзныя і вымагаюць актыўных дзеянняў.

### Дзіцячы час выйшаў

Праваахоўнікі заўважылі і яшчэ адну тэндэнцыю. Падлеткі часта «сваволяць» у цёмны час сутак.

— 40 адсоткаў злачынстваў здзейснена непаўналетнімі ў грамадскіх месцах у начны час, — зазначае А.Куляшоў.

Таму да месца была б забарона на знаходжанне іх там уначы. Яшчэ адно «не» нашым «жэўжыкам».

— Будуць і праціўнікі, і прыхільнікі, — прадбачыць рэакцыю міністр. — Натуральна ж, гэта непапулярны захад — абмежаваць падлетка. Аднак мы робім гэта не для сябе, а на карысць тых жа падлеткаў. Яны могуць стаць ахвярамі злачынстваў, заложнікамі абставін, калі будзе здзейснена сітуацыйнае злачынства — абрабаваць і збіць п'янага, каб зрабіць уражанне на кампанію. І не ўвёўшы падобных абмежаванняў, мы, магчыма, зламаем лёс чалавека.

У адказ на роспыты журналіста «Звязды» наконт будучага законапраекта Анатоль Куляшоў распавёў, што «прапановы Міністэрства ўнутраных спраў — не ісціна ў апошняй інстанцыі, будзем яшчэ абмяркоўваць з усімі зацікаўленымі». Аднак больш-менш канкрэтызаваць часавыя рамкі ўсё ж атрымалася. «Па Канстытуцыі начны час пачынаецца з 23 гадзін, але некаторыя прапануюць і з 22.00», паведаміў міністр. На чым сыдуцца заканадаўцы, пакажа час.

### За адміністрацыйнае парушэнне — у спецустанову

Летась з прыкладна 300 непаўналетніх, якія здзейснілі адміністрацыйныя парушэнні тры і больш разы за год, прыблізна 100 правініліся зноў. На сітуацыю станоўча паўплывала б, на думку міністра, заканадаўчае рэгуляванне — ізаляцыя такіх падлеткаў. Адпраўленне «рэцыдывістаў» у спецыяльныя навучальна- і лячэбна-выхаваўчыя ўстановы прадугледжана заканадаўчымі папраўкамі, якія хутка маюць быць разгледжаныя Палатай прадстаўнікоў у другім чытанні. Яны рэгламентуюць сістэму прафілактыкі безнагляднасці і праваапарушэнняў непаўналетніх. Пакуль туды выпраўляюцца толькі за крымінальныя злачынствы. Многія хвалююцца: як гэта за дробнае парушэнне адправіць малога ў асяродак злачынцаў? Не ўтойваюць свайго клопату і дэпутаты.



— Усіх павальна туды скіроўваць не будуць, — супакойвае іх міністр. — У кожным выпадку будзе індывідуальны падыход. Будуць ацэньваць і ўмовы пражывання, і сям'ю, і паводзіны — увесь комплекс праблемных пытанняў. І [адпраўляць у спецустановы] толькі тады, калі ўсе астатнія магчымасці вычарпаныя. Іншага шляху няма — інакш яны не паддаюцца перавыхаванню.

У той жа час А. Куляшоў прызнае:

— Па сутнасці, гэта карныя элементы: мы пазбаўляем маладога чалавека права перасоўвання, магчымасці займацца справай, якая яму падабаецца. Але ж гэта змушаны захад, каб захаваць нашу моладзь, годную будучыню. З цягам часу прааналізуем, паглядзім з розных бакоў, і, калі будуць падставы, прымем іншае рашэнне.

Не пакаранне, а сацыяльнае выхаванне, так кажа пра спецыяльныя ўстановы **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.** І на карысць яго слоў кажа тое, што яны насамрэч адносяцца да сістэмы адукацыі, а не выканання пакаранняў МУС. Некаторым дзецям можна дапамагчы толькі ва ўмовах закрытага педагагічнага асяроддзя. «Гэта ўпісваецца ў прынцыпы і падыходы, распрацаваныя сусветнай супольнасцю», — адзначае міністр і спасылаецца на прыклад Швецыі, дзе ў закрытыя ўстановы за год трапляе каля 1,5 тыс. дзяцей.

У Беларусі дзейнічае тры спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя і адна лячэбна-выхаваўчая ўстанова. 218 падлеткаў праходзяць там рэабілітацыю. У нас выхаванцы такіх устаноў — гэта дзеці ад 11 да 18 гадоў, якія маюць патрэбу ў асаблівых умовах выхавання і ўтрымання. Яны здзейснілі небяспечныя для грамадскасці дзеянні, прадугледжаныя Крымінальным кодэксам, але не дасягнулі паўналецця — узросту, з якога наступае крымінальная адказнасць.

Тэрыторыя спецустаноў ахоўваецца. Дэпутаты пабачылі гэта на свае вочы, наведваючы Магілёўскае дзяржаўнае спецыяльнае ПТВ закрытага тыпу № 2. Уражанне неадназначнае. Здавалася б, ідылічны малюнак. Вось малыя гуляюць ў більярд (на фота), па чарзе адпраўляючы шары ў лузы. Вось засяроджана глядзяць на манітор у камп'ютарным класе. У які пакой ні зазіраюць цікаўныя дэпутаты, тамтэйшыя жыхары першымі вітаюць гасцей. Усе такія ціхія і ветлівыя. «Каля 80% трапляюць сюды за крадзяжы», — прыгадваюцца словы міністра. Злёгку пасунуўшы фіранку, атрымліваю від з акна на высачэзны масіўны плот. І мне застаецца толькі здагадвацца, што хаваецца за ўсім гэтым знешнім спакоем...

Сярод выхаванцаў пераважна 15-гадовыя хлопцы. Максімальны тэрмін, які тут праводзяць, — два гады. За мінулую пяцігодку толькі 3,7 адсотка выпускнікоў зноў парушылі закон. Неблагой статыстыцы па выпраўленні крымінальных злачынцаў, відаць, і будуць абавязаны сваім адпраўленнем сюды тыя, хто сістэматычна прыцягваецца за адміністрацыйныя парушэнні. Каб не панадна было...

— Гэта будзе менавіта прафілактычны захад, — адзначае С.Маскевіч. — Зусім неабавязкова змяшчаць іх сюды на гады. 6 месяцаў — абсалютна нармальны тэрмін.

Тутэйшыя выхаванцы атрымліваюць спецыяльнасць. Вывучыцца можна, напрыклад, на сталяра. Дэпутаты разглядаюць драўляныя вырабы і з куды большым здзіўленнем — цэлыя шэдэўры з пацерак. Маўляў, няўжо гэта робяць хлопцы? У спецустанове, відаць, яшчэ і не такому навучышся...

— У вольны час выхаванцы спецустаноў могуць у суправаджэнні педагогаў браць удзел у экскурсіях, наведваць басейны, музеі, выставы. Для іх няма абмежаванняў у атрыманні лістоў, пасылак, грашовых пераводаў, перадач. Іх могуць наведваць бацькі, — распавядае міністр адукацыі.

Паводле яго ўражанняў, «у свядомасці людзей ёсць уяўленне аб судзімасці падлеткаў, якіх скіроўваюць у спецустановы». У процівагу стэрэатыпу міністр падкрэсліў «выключна рэабілітацыйную місію» такіх устаноў.

Дапамагчы такім падлеткам можна, толькі забраўшы іх з асацыяльнага асяроддзя, перакананы міністр адукацыі. Таму і ў заканадаўства ўносяцца карэкціроўкі — стане больш падстаў для змяшчэння падлеткаў у такія ўстановы. Ён падзяліўся вынікамі анкетавання: 90% выхаванцаў спецустаноў лічаць сваё змяшчэнне туды справядлівым. Пазітыўныя планы на будучыню будуюць 89%. 98% асуджаюць свае ранейшыя паводзіны і імкнуцца іх выправіць.

— Людзі думаюць, нібыта гэта турма. А гэта звычайная школа, — кажа Сяргей Маскевіч.

### Акварыумны спакой

Найбольш цяжкіх падлеткаў перавыхоўваюць у калоніях. Тут таксама праходзяць прафесійнае навучанне, ёсць вытворчыя майстэрні. Аднак вось яны ўжо ў ведамстве МУС. Гэта дзве выхаваўчыя калоніі — у Бабруйску і Віцебску. У бабруйскай пабывалі народныя выбраннікі.

На фоне тутэйшых умацаванняў плот на ўваходзе ў спецвучылішча — проста дзіцячы лепет. Яшчэ б, сюды трапляюць самыя праблемныя падлеткі — за цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы. Цялесныя пашкоджанні, згвалтаванні, забойствы.

У кожным спальным пакоі тут па акварыуме. «У Палаце прадстаўнікоў ніводнага акварыума», — заўважаюць дэпутаты. Вадзічка, рыбкі — любата. Відаць, каб заспакойваліся. А мне штосьці не да спакою тут...

«Цяжкія цялесныя», — чаканіць падлетак, адказваючы, за што ён тут, міністру ўнутраных спраў. Той спрактыкаваным вокам вылучыў яго сярод аднакашнікаў: «Дужа саромеецца, відаць, нешта сур'ёзнае зрабіў». Прабіў малатком чэрап свайму дзядзьку. Нанёс 23 удары кулаком па галаве. Амаль усе яны ўсміхаюцца, калі вымаўляюць такое. Такая засцерагальная рэакцыя, відаць.

Адзін з выпускнікоў калоніі, кажуць, паступіў у БДУ і вывучае там цяпер сацыялогію дзіцячай злачыннасці. Можа, і не ўпустую трацяцца тыя 2,8 млн рублёў штомесяц на ўтрыманне ў калоніі аднаго непаўналетняга...

Уражанне, як сказаў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,** засталося дваякае. З аднаго боку, цяжка на душы, што маладыя людзі так праводзяць свой час. З іншага, уцешна, што дзяржава іх не кідае.

— Так, важна, што ёсць такія ўстановы, што яны выдатна абсталяваныя. І калі мы гутарылі з дзецьмі, асобныя казалі нават, што не хочуць пакуль адсюль з'язджаць. Хочуць падоўжыць сваё знаходжанне тут, атрымаць нейкую спецыяльнасць. Але ж такія спецыяльныя навучальныя ўстановы — гэта ўжо вынік, — дзеліцца спікер сваімі развагамі з журналістамі. — Бяда пачынаецца тады, калі гэта дзіця недагледжанае, калі яму ніхто не надае ніякай увагі. У рэшце рэшт нам трэба сур'ёзна заняцца сям'ёй. Вось там у нас велізарныя праколы ў гэтай рабоце. Вельмі шмат нядбайных бацькоў, якія не займаюцца выхаваннем сваіх дзяцей. Маладыя людзі, калі ўступаюць у шлюб, не гатовы мець сям'ю, выхоўваць дзяцей. Сёння вельмі шмат у нас няпоўных сем'яў. Вось гэтаму варта надаваць увагу — і дзяржаўным органам, і грамадскім арганізацыям, і царкве — усім мірам працаваць з сям'ёй, з бацькамі.

Шмат трэба рабіць і ў школе, перакананы старшыня ніжняй палаты парламента.

— Мы больш сёння надаём увагі адукацыі, новым тэхналогіям, і гэта, відаць, слушна. Але малавата ў школе надаём увагі выхаванню.

У. Андрэйчанка акцэнтаваў увагу на тым, што ў аснове работы з падлеткамі павінны ляжаць не забарончыя захады, а стварэнне неабходных умоў для іх самарэалізацыі.

— Створаны ўмовы для заняткаў фізкультурай і спортам не толькі ў сталіцы, абласных цэнтрах, але і практычна ў кожным раёне, аграгарадку. Аналагаў нашай сістэмы аздараўлення дзяцей і моладзі няма на ўсёй постсавецкай прасторы, — адзначае Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Дэпутаты, як выказаўся спікер, вырашылі падтрымаць падлеткаў духоўна — перадалі ім кнігі. Там толькі мастацкая літаратура. І ніякіх дэтэктываў. Хопіць ужо.

**Ала МАЧАЛАВА,**
*Магілёўская вобласць.*

# ТАМУ ШТО НАМ ТАК ЗАХАЦЕЛАСЯ...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**ПРА «ЕЎРАБАЧАННЕ»**

**— Як вы ацэньвалі шанцы нашай краіны на «Еўрабачанні» ў гэтым годзе?**

**«U-LIFE»:** Песня добрая, але фармат не для «Еўрабачання». На гэты конкурс трэба глядзець з еўрапейскага пункту погляду. Настасся — малайчына, яна зрабіла ўсё на высокім узроўні. Але вось трохі не дацягнула. Аднак мы жадаем ёй поспехаў у будучым, будзем спадзявацца, што ў яе ўсё атрымаецца ў плане творчасці.

**— Хто з беларускіх выканаўцаў, на ваш погляд, змог бы годна прадставіць нашу краіну на гэтым конкурсе?**

**Іван**: Мне цяжка нешта сказаць на гэты конт, паколькі я шмат часу праводжу ў Маскве і з беларускай эстрадай знаёмы пакуль не так добра. Але, на мой погляд, гэта павінен быць чалавек з добрай унутранай падачай, каб на сцэне ён змог поўнасцю раскрыцца.

**Аляксей**: Чалавек шчыры, гатовы працаваць з публікай, паважаць яе і любіць. Людзі ж адразу адчуваюць фальш.

**— А самі стаць удзельнікамі «Еўрабачання» не плануеце?**

**Раман**: Для ўдзелу ў гэтым конкурсе неабходна паспець творча, калектыўна. На самай справе неабходна стаць прафесіяналам, каб пасля, не перамогшы ці наадварот, працягваць працу, развівацца.

**АБ СЯМ'І**

**— А як вашы родныя адносяцца да таго, што вы робіце? Не супраць?**

**Іван**: Я вельмі люблю сваіх бацькоў і вельмі рады, што яны ўсяляк падтрымліваюць мяне ў маёй творчасці. Менавіта мае родныя дапамаглі мне стартаваць, і вось ужо столькі часу я ўпэўненым крокам рухаюся па дарозе музыкі і моды.

**Раман**: Мае родныя таксама толькі «за». Яны верацьу мае магчымасці і заўсёды мяне падтрымліваюць. Хвалююцца, вядома. І я за гэта хачу сказаць ім вялікі дзякуй.

**Аляксей**: Мае бацькі прымаюць вялікі ўдзел у маім творчым жыцці. Ніводзін момант не застаўся без абмеркавання з імі. Я ведаю, што ў іх я заўсёды змагу знайсці карысную параду і дапамогу. Мы разам карэктуем усе мае творчыя ідэі. Я іх вельмі люблю і хвалююся за іх таксама, як яны хвалююцца за мяне. Мне пашчасціла ў тым плане, што мае бацькі таксама творчыя людзі, як і ва ўсіх удзельнікаў нашага калектыву.

**ПЛАНЫ НА БУДУЧЫНЮ**

**«U-LIFE»**: Прадухіліць канец свету. Мы лічым, што мастацтва выратуе зямны шар і яго насельнікаў. Трэба толькі шчыра верыць у гэта.

**ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ**

**«U-LIFE»:** Напрыканцы хочацца даць параду ўсім: смела ўвасабляйце свае творчыя ідэі ў жыццё! Не бойцеся рызыкі і магчымасці быць незвычайнымі!

**У пытаннях музыкі і моды разбіралася Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

# ЯНЫ ПАКУЛЬ НЕЖАНАТЫЯ...

Нядаўняе вяселле прынца Уільяма і Кэтрын Мідлтан выклікала цэлае мора зайздросных слёз па ўсім свеце. Амерыканскі часопіс Forbes супакойвае ўсіх — ён склаў спіс свабодных на сёння манаршых сэрцаў.

### 1. Кароль Джыгме Кхесар Намг'ял Вангчук, Бутан



Пяты ў каралеўскай дынастыі Дракона кароль Бутана Джыгме Кхесар Намг'ял Вангчук узышоў на трон у 2006 годзе пасля адрачэння бацькі. Атрымаўшы адукацыю на радзіме, ён таксама вучыўся ў некалькіх каледжах ЗША і Вялікабрытаніі і абараніў дысертацыю па паліталогіі ў Оксфардзе. Менавіта яму краіна абавязана пераходам ад абсалютнай манархіі да канстытуцыйнай. Зараз Намг'ялу 31 год, і на сёння ён самы малады кіраўнік у свеце, прычым дагэтуль нежанаты. Але гэта хутчэй тлумачыцца тым, што груз ускладзенай на яго адказнасці не дае яму магчымасці сур'ёзна заняцца пошукамі жонкі, а несур'ёзных адносінаў кароль не жадае.

### 2. Прынцэса Шарлота Казірагі, Манака



Марыць змяніць прозвішча 24-гадовая прынцэса Манака (і па сумяшчальніцтве ўнучка вялікай Грэйс Келі) Шарлота Казірагі. Яе любяць далёка за межамі краіны — за маладосць, прыгажосць і бездакорны густ. Выхаваная разам з братамі ў Францыі, прынцэса Шарлота з'яўляецца 4-й прэтэндэнткай на трон, але такая, хай нават і аддаленая, будучыня не вельмі вабіць свецкую львіцу — дзяўчына аддае перавагу пісаць артыкулы ў розныя глянцавыя часопісы, катацца на конях і іграць на фартэпіяна. Вядома, што вакол манакскай прынцэсы ўецца велізарная колькасць мужчын, але нікому яшчэ не ўдалося займець яе сэрца надоўга.

### 3. Амедэа, прынц Бельгіі



25-гадоваму бельгійскаму прынцу Амедэа Мары Джозафу Карлу П'еру Філіпу Паола Маркус Д'Авіана трон не свеціць — занадта вялікая чарга. Але тым не менш каралеўская кроў і прыстойнае багацце яго дзецям гарантаваныя. Амедэа скончыў Школу эканомікі ў Лондане. Акрамя таго, ён носіць званне афіцэра запасу бельгійскай арміі. Зараз сціплы і сур'ёзны малады чалавек працуе ў найбуйнейшай аўдытарскай кампаніі Deloitte Touche Tohmatsu ў Нью-Ёрку. Хобі прынца — бег, і яго захапленне не абмяжоўваецца ранішнімі прабежкамі з плэерам вакол парку: у 2008 годзе ён прымаў удзел у марафоне. Так што ахвотныя могуць паспрабаваць абагнаць Амедэа на адной з дарожак Цэнтральнага парку Нью-Ёрка.

### 4. Прынцэса Сіханіза Дламіні, Свазіленд



23-гадовая прынцэса Сіханіза Дламіні, старэйшая з 24-х дзяцей караля Мсваці III, нарадзілася ў Свазілендзе — афрыканскай краіне, дзе да гэтага часу формай праўлення застаецца абсалютная манархія. Нягледзячы на гэта, яна атрымала добрую адукацыю ў прыватных школах Еўропы і ва ўніверсітэце Biola ў Лос-Анджэлесе, дзе вывучала сцэнічнае мастацтва. Маючы ўсе магчымасці для таго, каб весці раскошны лад жыцця ў Еўропе ці Амерыцы, прынцэса не можа абстрагавацца ад праблем сваёй краіны і займаецца прапагандай барацьбы са СНІДам, бо яе краіна знаходзіцца на першым месцы ў свеце па колькасці ВІЧ-інфіцыраваных. Акрамя таго, не баючыся наклікаць на сябе бацькоўскі гнеў, Сіханіза выступае супраць патрыярхату і традыцыяналізму ў роднай краіне. Ёсць у прынцэсы і свой спосаб адключыцца ад дзяржаўных праблем — яна захопленая стварэннем рэп-музыкі. Як старэйшая дачка, Сіханіза мае ўсе шанцы стаць каралевай Свазіленда, але разам з тытулам яна атрымае і вялікую колькасць праблем, якія ёсць у яе краіне: СНІД, беспрацоўе і дзіцячая смяротнасць. Так што гэтая дзяўчына з усім яе багажом — варыянт толькі для моцных духам мужчын, а не проста для шукальнікаў багатай спадчынніцы.

### 5. Прынц Гары Валійскі, Вялікабрытанія



Малодшы брат шчаслівчыка Уільяма, 26-гадовы Генры (Гары) Чарльз Альберт Дэвід, нягледзячы на тое, што сёння з'яўляецца трэцім у чарзе на брытанскі трон, таксама вельмі зайздросны жаніх. Рудавалосы прыгажунчык скончыў з адзнакай Ітанскі каледж і прайшоў курс у Каралеўскай ваеннай акадэміі ў Сэндхёрсце, атрымаўшы званне другога лейтэнанта, пасля чаго паехаў ваяваць у Афганістан. Моцным бокам Гары заўсёды быў спорт: ён ведае ўсё пра футбол, гуляе ў пола, рэгбі, плавае і катаецца на кані. Прэса вельмі любіць параўноўваць двух братоў, і звычайна параўнанне не на карысць малодшага — ён лічыцца хуліганам, здольным на розныя дыскрэдытуючыя сям'ю выхадкі. Але на самай справе ў гэтага медаля, як і ў любога іншага, ёсць і адваротны бок — Гары вельмі мілы і просты хлопец, якому лёгка спадабацца і з якім весела, таму што ён не забівае галаву справамі дзяржаўнай важнасці. Тым не менш менавіта Гары працягвае справу сваёй маці — прынцэсы Дзіяны — і актыўна займаецца дабрачыннасцю, збіраючы грошы для краін трэцяга свету і здымаючы пра іх дакументальныя фільмы.

### 6. Прынцэса Іман бінт аль-Хусейн, Іарданія



28-гадовая прынцэса Іман бінт аль-Хусейн некалькі гадоў свайго жыцця прысвяціла ваеннай кар'еры, што зусім не вяжацца з яе жаноцкай знешнасцю. Тым не менш у 2002 годзе прынцэса скончыла ўжо згаданую Ваенную акадэмію Сэндхёрст у Англіі і некаторы час служыла ў іарданскай арміі. Што ж тычыцца хобі, то прынцэса як сапраўдная амазонка захапляецца конным спортам. Нядзіўна, што іарданская красуня да гэтага часу не знайшла сабе мужа — моцных жанчын баяцца не толькі ў нас.

### 7. Прынц Андрэа Альберт П'ер Казірагі, Манака



Старэйшы брат прыгажуні Шарлоты Казірагі, не менш прывабны 26-гадовы Андрэа Альберт П'ер Казірагі з'яўляецца другім прэтэндэнтам на пасаду пасля сваёй маці — прынцэсы Караліны. Андрэа скончыў некалькі вышэйшых навучальных установаў, займаўся візуальнымі мастацтвамі і міжнароднай палітыкай. Прынц шмат чытае, але гэта не замінае яму наведваць разнастайныя свецкія раўты. Загадкавы і рамантычны, як персанаж фільма «Інтэрв'ю з вампірам», Андрэа Казірагі даўно прыцягвае да сябе ўсеагульную ўвагу. А актыўнае свецкае жыццё ў лонданскіх клубах і прыхільнасць да віскі даюць магчымасць шукальніцам прыгод паспрабаваць шчасця ў гэтым кірунку.

### 8. Шэйх Хамдан бен Махамед Аль-Мактум, ААЭ



28-гадовы шэйх Хамдан бен Махамед бін Рашыд, адзін з 19 дзяцей шэйха Махамеда бен Рашыда аль-Мактума — наследны прынц Дубая. Ужо цяпер шэйх ушчыльную займаецца дзяржаўнымі справамі, з'яўляючыся старшынёй Выканаўчага савета Дубая. Выдатна адукаваны, Хамдан скончыў ваенную акадэмію Сэндхёрст, а пасля гэтага — Лонданскую школу эканомікі. Палітыка — далёка не адзінае прызначэнне маладога шэйха, і ў вольны ад працы час ён піша вершы, публікуючы іх пад псеўдонімам Fazza. Акрамя вершаў, якія дэкламуе ўся краіна, да хобі наследнага прынца адносяцца вярблюды, на якіх шэйх траціць шалёныя грошы, а таксама аўтамабілі і скачкі з парашутам. У гэтага маладога прыгажуна ёсць толькі адзін недахоп: ніхто не дасць вам гарантыі, што шэйх абмяжуецца адзінай жонкай.

### 9. Прынцэса Такамада, Японія



Пра жыццё 25-гадовай стрыечнай сястры японскага імператара — Цугука дэ Такамада — вядома няшмат: Японія вельмі дбайна засцерагае асабістае жыццё. Асабліва калі гэта тычыцца каралеўскіх асоб. Вышэйшую адукацыю Цугука атрымала ў Эдынбургу, скончыўшы ўніверсітэт па спецыяльнасці сацыялогія і псіхалогія. Працягнуць ж навучанне прынцэса вырашыла на радзіме, паступіўшы на факультэт міжнародных даследаванняў японскага ўніверсітэта Васэда. Дакладна вядома толькі, што Цугука любіць музыку ў стылі хіп-хоп (што б гэта ні азначала) і, нягледзячы на строгае японскае выхаванне, вельмі любіць тусавацца.

### 10. Прынцэса Сірыванавары, Тайланд



Унучка самага багатага манарха ў свеце — караля Тайланда Пуміпона Адульядэта — 24-гадовая прынцэса Сірыванавары вядомая не толькі тым, што выконвае прадстаўнічыя функцыі ад імя манаршай сям'і. У роднай краіне тайскую прынцэсу ведаюць як мадэльера — у 2007 годзе яе калекцыя Ethnic Rock была прадэманстраваная на Парыжскім тыдні моды, а ў 2008-м яна ж адкрывала Russian Fashion Week. Сірыванавары сур'ёзна ставіцца да сваёй прафесіі і ўвесь час удасканальваецца, то вывучаючы тэкстыльны дызайн у Японіі, то стажыруючыся ў Armani і Dior. Акрамя гэтага прынцэса прафесійна гуляе ў бадмінтон і ў 2006 годзе заваявала залаты медаль на Гульнях Паўднёва-Усходняй Азіі.

**Пазнай свой край**

# Тут ад кожнай травінкі дыхаецца лягчэй

Ёсць на карце Беларусі цудоўная вёска Каменны Барок. Яна знаходзіцца за 125 кіламетраў ад Мінска або за 27 км ад чыгуначнай станцыі «Несята» па аўтамабільнай дарозе Беразіно-Клічаў. Гэта мая малая радзіма.

У любую пару года, у любое надвор'е вёсачка зачароўвае. Гэта вельмі жывапіснае месца: возера, лясы і... камяні навокал. Колькі прыгажосці, свежага паветра і душэўнага спакою! Некалі яна была вялікай, і людзей жыло ў ёй шмат. Гісторыя гэтай вёскі даволі цікавая.

Невялічкі кавалачак зямлі — крыху больш за 10 гектараў — быў куплены ў 1882 годзе за золата сялянамі ў памешчыка Шыманскага, які жыў на той час у суседняй вёсцы Рудзенка. Гэтая зямля была ўсеяна камянямі. Але людзі не адступіліся перад цяжкасцямі. Яны вырашылі застацца і заснаваць тут вёску.

Спачатку вёска была названая Каменная. Другую частку назвы — Барок — дабавілі крыху пазней (першыя хаты былі пабудаваны на паляне сярод вечназялёнага сасновага бору). Так і атрымала вёска назву Каменны Барок.

Першымі жыхарамі вёскі з'яўляюцца: Лапцёнак Астап, Мурашка Трахім, Архіпец Цімох, Архіпец Змітрок, Галубец Васіль, Дзехцяронак Мікола.

Паступова ў вёсцы пасяляліся ўсё новыя і новыя жыхары. Іх жыццё было нялёгкім — працавалі ад зары да зары: карчавалі пні, будавалі жыллё, сеялі зерне, гадавалі скаціну, касілі, сеялі, жалі, малацілі... Усё сваімі рукамі.

З наступленнем савецкай улады стала мяняцца аблічча закінутай вёсачкі. Яна расла, будавалася. Ужо ў 1921 годзе быў утвораны сельскі Савет на чале са старшынёй Ліпскім, прысланым з горада Беразіно. Вялася падрыхтоўка да калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У 1936 годзе ў вёсцы ўпершыню загарэліся лямпачкі, была асветлена вуліца. Святло гарэла з 12 ночы да 6 раніцы. Асноўным палівам для лакаматыва былі карчы.

Працавала ваўначоска, сепаратарны пункт, што давала прыбыткі гаспадарцы. Была і школа, якую заснавалі ў 1922 як пачатковую. Вучыліся ў сялянскай хаце. У гэтую школу хадзілі дзеці з навакольных вёсак: Дубраўка, Рудзенка, Вязькуціна, Валоўніца і іншых. Збіралася па 50-60 вучняў, якія вучыліся адначасова ў адным пакоі. Першым настаўнікам і дырэктарам быў Сцяпан Сцяпанавіч Грычуц— строгі і патрабавальны чалавек. У класе заўсёды быў парадак.

Пазней (ужо ў 30-я гады) пабудавалі новае памяшканне, і школа стала сямігадовай. Прыехалі працаваць маладыя настаўнікі. Адкрыўся і дзіцячы садок, а ў 1936 годзе быў пабудаваны сельскі клуб, які працуе і зараз.

Да вайны ў вёсцы пражывала 433 чалавекі. Моладзь старанна вучылася, працавала. Мелі час і для адпачынку і весялосці.

Пачалася вайна. На абарону Радзімы з вёскі пайшло 60 чалавек. Яны змагаліся на франтах, у партызанскіх атрадах. Вайна — страшны час для ўсіх! Жыхары вёскі вытрымалі яго! Дапамога іх была вельмі патрэбна партызанам: ежа, адзенне, сувязь. Заставаліся час ад часу ў Каменным Барку партызаны. Даведаўшыся пра гэта, фашысты запалілі вёску. Згарэла датла сем дамоў. Людзі больш не заставаліся дома: як світала, усе ішлі ў лес.

З фронту ў роднае сяло не вярнуліся 15 чалавек, загінула баркоўскіх 5 партызан, фашысты расстралялі 6 мірных жыхароў...

У канцы 50-х гаспадарка аднавілася поўнасцю. У 1957 годзе калгас быў радыёфікаваны, а ў 1962 і электрафікаваны. З 1966 года у калгасе пачалася грашовая аплата працы. Даход вяскоўцаў павялічваўся. Пачалі прыязджаць спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. Будаваў калгас і жыллё.

А зараз у вёсцы каля 100 чалавек: жыхароў становіцца ўсё менш і менш. Асабліва моладзі. Паступова вёсачка вымірае. Мне ад гэтага вельмі турботна. Аднак, нягледзячы на ўсё, я з асаблівым пачуццём жыву ў ёй. Здаецца, я шмат ведаю пра жыццё вёскі... Не ўсё. Кожны дзень я адкрываю нешта новае і незвычайнае. Гэта можа быць як прыезд замежных гасцей, так і шчабятанне птушкі. Ад кожнай травінкі, здаецца, дыхаецца лепш.

Мне 16 гадоў. У мяне наперадзе яшчэ ўсё жыццё. І куды б мяне ні закінуў лёс, я заўсёды буду ўспамінаць аб родным куточку. Я ніколі, ніколі не скажу кепска пра родную зямлю.

**Кацярына ЛЯСУН.**

# Дзіцячыя СМІ павінны несці сацыяльную адказнасць за інфармацыю

**Напрыканцы мая Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя (ТРА) Саюзнай дзяржавы запускае на «Радыё Расія» новы праект — «Беларускія казкі для расійскіх слухачоў». Аб гэтым удзельнікам «круглага стала» «Дзіцячыя СМІ ў Саюзнай дзяржаве: праблемы і перспектывы» паведаміла першы намеснік старшыні ТРА Тамара ВЯТСКАЯ.**

Па словах Тамары Вятскай, ёсць праекты, якія рэалізуюцца ў Саюзнай дзяржаве ўжо не перш год, але большасць з іх скіравана пераважна на дарослых: «Напэўна, прыйшоў час звярнуць увагу і на дзіцячую аўдыторыю, каб і маленькія беларусы, і маленькія расіяне ведалі, што яны растуць у Саюзнай дзяржаве...»

— На жаль, мы вымушаны канстатаваць, што ў спектры СМІ Саюзнай дзяржавы няма друкаваных СМІ, арыентаваных на дзіцячую аўдыторыю, — падкрэсліла ў сваім выступленні **начальнік Дэпартамента сацыяльнай палітыкі і інфармацыйнага забеспячэння Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Таццяна КАВАЛЁВА.** — Увогуле існуе вельмі шмат праблем з якасцю інфармацыі для дзяцей. Між іншым, дзеці з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі саюзнага жыцця і ў іх ёсць патрэба ў зносінах, ёсць шмат пытанняў, якія тычацца магчымасці атрымання адукацыі ў суседняй дзяржаве, аздараўлення, турыстычных вандровак і гэтак далей. Дзеці жадаюць чытаць пра сваё жыццё, пра жыццё сваіх сяброў, жадаюць самі пісаць і ў іх гэта цудоўна атрымліваецца. Ад творчых работ удзельнікаў алімпіяды «Беларусь—Расія: гістарычнае і духоўнае адзінства» журы проста ў захапленні...

**Першы намеснік міністра інфармацыі нашай краіны Лілія АНАНІЧ** упэўненая, што колькі б мы ні пісалі і ні разважалі пра перспектывы Саюзнай дзяржавы, колькі б газет, часопісаў, тэлепраграм ні выпускалі, аднак адштурхоўвацца трэба ад выхавання падрастаючага пакалення, бо менавіта ў дзяцінстве закладваюцца асновы будучых узаемаадносін партнёраў па Саюзнай дзяржаве:

— Трэба праводзіць сістэмную работу ва ўсіх СМІ Саюзнай дзяржавы, каб там пастаянна прысутнічала дзіцячая тэматыка. Пры рабоце з чытацкай і глядацкай аўдыторыяй нельга забываць пра яе дзіцячую частку. Трэба паўсюдна вылучаць і падтрымліваць юнкараў, якія актыўна супрацоўнічаюць з «дарослымі» выданнямі...

— У чым я абсалютна ўпэўнены, дык гэта ў тым, што ў дзіцячых выданнях не павінна прысутнічаць павучальнасць. Як толькі там з'яўляецца палец, лічы, што ты страціў свайго чытача, — падзяліўся сваімі думкамі пісьменнік, **лаўрэат расійскай нацыянальнай прэміі «Бронзавы мікрафон» Вадзім НОСАЎ**. — Разам з тым, дзіцячы погляд на «дарослыя рэчы» дапамагае нам убачыць ісціну. Сёння ў Расіі налічваецца прыкладна 3,5 тысячы дзіцячых выданняў, але сапраўды добрых, дзе працуюць прафесійныя журналісты, якія валодаюць і педагагічнымі, і этычнымі навыкамі, і пачуццём меры, няшмат. Нядаўна мы пры падтрымцы маскоўскага ўрада выпусцілі кнігу «Я да вас пішу», у якой аб'яднаны дзіцячыя лісты пра галоўнае: лісты да прэзідэнта, лісты пра Радзіму, лісты да бацькоў і гэтак далей. Мы расцэньваем работу над лістом як працу дзіцяці над сабой. Асабліва цікавымі былі лісты, якія дзеці адрасавалі сваім дзядулям і прадзедам у 41-шы, 43-і, 45-ты гады: «Дарагі дзядуля, Мікалай Іванавіч! У чэрвені 41-га года ты быў прызваны на фронт, а ў кастрычніку цябе не стала. Таму многіх падзей ты не бачыў, але не перажывай. Вайну мы выйгралі. Нашы ўзялі Берлін — значыць, мы перамаглі, а пераможцы заўсёды вяртаюцца. Я цябе чакаю. Матуля мяне ўжо адпускае ў магазін, і я сам усё прынясу да святочнага стала. Твой унук Саша. Горад Масква»...

— Пагадзіцеся, што адукаваныя людзі павінны ведаць не толькі фізіку і матэматыку, але і сваю культуру, і нацыянальную літаратуру. А калі да нас на работу прыходзіць выпускнік Лінгвістычнага ўніверсітэта, які не ведае, хто такі Іван Мележ, то, напэўна, гэта вельмі трывожны сігнал для нашага грамадства, — падзяліўся набалелым **галоўны дырэктар галоўнай дырэкцыі замежнага вяшчання Беларускага радыё, вядомы паэт і публіцыст Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.** — Прызнаюся, што гэта зусім няпростая задача — данесці да сучасных дзяцей веды па гісторыі і краязнаўстве, прывіць ім павагу да нацыянальных традыцый і гонар за суайчыннікаў. Разам з выдавецтвам «Пачатковая школа» ў нас з'явілася ідэя стварэння серыі кніг «Гарады і гістарычныя мясціны Беларусі». Першай выйшла кніжка пра Полацк, прызначаная для вучняў малодшых і сярэдніх класаў. Ужо падрыхтавана да друку кніга пра Мінск. Упэўнены, што гэта серыя можа стаць выдатным падручнікам па краіназнаўстве не толькі для беларускіх школьнікаў, але і для юных расіян, і лічу, што гэтыя кнігі павінны быць прадстаўлены не толькі ў кожнай школьнай бібліятэцы, але і быць на стале ў кожнага школьніка.

— Наш доўг — перадаць дзецям тыя маральныя каштоўнасці, якія ва ўсе часы існавалі на нашай зямлі. І мы невыпадкова распачалі серыю менавіта з аповеду пра Полацк, бо гэты горад з'яўляецца калыскай беларускай гісторыі і культуры. Аднак у планах выдавецтва ахапіць усе значныя і цікавыя рэгіёны, гарады і мястэчкі нашай радзімы, каб дзеці атрымалі поўнае і сістэмнае ўяўленне аб Беларусі, яе культурнай і гістарычнай спадчыне, — дапоўніла Навума ГАЛЬПЯРОВІЧА **дырэктар выдавецтва «Пачатковая школа» і шэф-рэдактар дзіцячых часопісаў выдавецтва «Пачатковая школа» Наталля ВАНІНА.**

Трэба дадаць, што кнігі «Я грамадзянін Рэспублікі Беларусь», «Беларусь — краіна тваёй будучыні» з дадаткамі на кампакт-дысках і «Беларусь — наша радзіма» (кніга для першакласніка), якія выпускаюцца выдавецтвам «Пачатковая школа», выклікаюць непадробную цікаўнасць і жаданне пераняць беларускі досвед у калег з краін СНД і Балтыі. На ўсіх міжнародных выставах яны выклікаюць сапраўдны фурор.

Беларускім выдавецтвам ёсць што прапанаваць пакупнікам (кожная дзясятая кніга, што выпускаецца ў Беларусі, прызначаецца для дзяцей), аднак ці часта вам даводзілася бачыць на цэнтральных месцах на паліцах магазінаў ці шапікаў беларускія дзіцячыя кнігі і часопісы? Ёсць і яшчэ адзін важны нюанс: у Беларусі ПДВ на выпуск дзіцячых кніг складае 20 працэнтаў, у Расіі — 10, а ва Украіне — і ўвогуле 6 працэнтаў. Беларускія выдаўцы прызнаюцца, што пры такіх умовах канкурыраваць з суседзямі ім даволі праблематычна...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Конкурс для юных беларусаў і расіян: «Свой свет мы будуем разам»

**Выдавецтва «Пачатковая школа» пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы абвяшчае конкурс для школьнікаў на веданне агульнай гісторыі, геаграфіі, эканомікі, культуры і літаратуры Беларусі і Расіі.**

Інтэлектуальныя спаборніцтвы будуць праходзіць сярод дзяцей і падлеткаў у двух узроставых групах: у групе ад 12 да 14 гадоў і ад 15 да 17 гадоў. Конкурс складаецца з двух блокаў: напісання творчай работы і адказаў на пытанні віктарыны. Галоўным прызам для пераможцы стане паездка ў расійскі горад Анапа на міжнародны фестываль «Творчасць юных».

Для творчай работы прапануюцца наступныя тэмы:

1. Канцэпцыя сумеснага праекта ўстаноў адукацыі, моладзевых, навуковых калектываў ці грамадскіх арганізацый Беларусі і Расіі.

2 Сачыненне на тэму супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў сферы культуры, адукацыі, аховы здароўя ці спорту.

3. Мастацкі твор на тэму яднання народаў Саюзнай дзяржавы. Гэта можа быць карціна, скульптура, фатаграфія, дызайнерскі праект, музычная кампазіцыя і гэтак далей. Від і жанр мастацтва канкурсант вызначае самастойна.

Творчыя работы могуць адлюстроўваць розныя гістарычныя перыяды: ад найбольш ранніх этапаў фарміравання нашых народаў да сучаснасці.

Ахвотныя прыняць удзел у конкурсе павінны падаць 3 творчыя работы і адказы на пытанні 9 віктарын да 29 лютага 2012 года. Больш падрабязна аб умовах удзелу ў конкурсе можна даведацца на сайце выдавецтва «Пачатковая школа» www.p-shkola.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ АКЦИЙ ОТКРЫТЫХ АКЦИОНЕРНЫХ ОБЩЕСТВ**

Конкурсы состоятся **8 июля 2011 г.** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.
Организатор конкурсов – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде: штук акций | Доля государства в уставном фонде: в % к УФ | Количество продаваемых акций: штук акций | Количество продаваемых акций: в % к УФ | Начальная цена продажи акций, рублей | Условия конкурса |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Открытое акционерное общество «БобруйскАТЭП» (ОАО «БобруйскАТЭП») 213830, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 100 | 209669 | 7000 | 187114 | 89,2 | 80303 | 38,3 | 1630809390 | Предоставить открытому акционерному обществу «БобруйскАТЭП» заем в сумме, эквивалентной 415 тыс. долл. США, под 1% годовых в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций. |
| 2 | Открытое акционерное общество «Бобруйский грузовой автомобильный парк № 1» (ОАО «Бобруйский грузовой автомобильный парк № 1») 213830, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 123-1 | 514345 | 4400 | 505325 | 98,2 | 243028 | 47,3 | 1890944903 | Предоставить открытому акционерному обществу «Бобруйский грузовой автомобильный парк № 1» заем в сумме, эквивалентной 391 тыс. долл. США, под 1% годовых в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций. Обеспечить ежегодное обновление подвижного состава на 10% в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций и в течение 1 года завершение строительства автоучебного комбината. |
| 3 | Открытое акционерное общество «Бобруйсктранс» (ОАО «Бобруйсктранс») 213830, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181 | 478505 | 4400 | 475801 | 99,4 | 231740 | 48,4 | 1837918726 | Предоставить открытому акционерному обществу «Бобруйсктранс» заем в сумме, эквивалентной 365 тыс. долл. США, под 1% годовых в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций. |
| 4 | Открытое акционерное общество «Према» (ОАО «Према») 213410, Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, ул. Черникова,15 | 5006689 | 1000 | 4992284 | 99,7 | 4992284 | 99,7 | 384028073098 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Према» в виде вклада денежные средства в сумме 3,0 млрд. рублей, в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций с направлением указанных средств на развитие общества. |
| 5 | Открытое акционерное общество «Белоозерский энергомеханический завод» (ОАО «БЭЗ») 225215, Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Заводская, 1 | 4996066 | 4400 | 4933268 | 98,7 | 1186218 | 23,7 | 30286468613 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Белоозерский энергомеханический завод» в виде вклада денежные средства в сумме 8815 млн. рублей в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций с направлением указанных средств на техническое перевооружение общества. |
| 6 | Открытое акционерное общество «Лидские пищевые концентраты» (ОАО «Лидапищеконцентраты») 231300, Гродненская обл., г. Лида, ул. Тавлая, 11 | 1013107 | 11000 | 816970 | 80,6 | 816970 | 80,6 | 11960532343 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Лидские пищевые концентраты» в виде вклада денежные средства в сумме 9,0 млрд. рублей в течение 3 лет с даты подписания договора купли-продажи акций с направлением указанных средств на развитие общества. Обеспечить сохранение в течение 3 лет с даты подписания договора купли-продажи акций количества рабочих мест и профиля деятельности общества, а также сохранение и финансирование в течение 5 лет объектов социального назначения, переданных обществу по договору безвозмездного пользования имуществом, находящимся в собственности Республики Беларусь. |

Время проведения конкурсов по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций:

ОАО «БобруйскАТЭП» – 9.00; ОАО «Бобруйский грузовой автомобильный парк № 1» – 9.40; ОАО «Бобруйсктранс» – 10.20; ОАО «Према» – 11.00; ОАО «БЭЗ» – 11.40; ОАО «Лидапищеконцентраты» – 12.20.

Для участия в конкурсе по продаже акций соответствующего акционерного общества в срок **до 16.00 22 июня 2011 г.** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401 представляются следующие документы:

заявление на участие в конкурсе по форме, утвержденной Государственным комитетом по имуществу;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором конкурса, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор);

юридическими лицами, иными организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальными предпринимателями – резидентами Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором конкурса;

индивидуальными предпринимателями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителями граждан Республики Беларусь, индивидуальных предпринимателей – резидентов Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителями иностранных физических лиц, индивидуальных предпринимателей – нерезидентов Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в конкурсе физические лица, индивидуальные предприниматели, представители физических лиц, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц, иных организаций предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором конкурса.

В случаях, установленных законодательством, дополнительно представляется документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки.

Задатки для участия в конкурсах уплачиваются в размере 10 процентов от начальных цен продажи акций в срок до **5 июля 2011 г.** согласно договорам о задатке, заключаемым с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: в бел. рублях на счет № 3642974000028; в EURO на счет № 3642974005036; в USD на счет № 3642974005052; в рос. рублях на счет № 3642974008046 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Участники конкурсов, выигравшие соответствующий конкурс, обязаны возместить затраты на организацию и проведение конкурсов в течение 3 рабочих дней с даты их проведения.

Договора купли-продажи акций по результатам конкурсов заключаются в течение 20 календарных дней с даты их проведения.

Дополнительная информация об объявленных конкурсах размещена на официальном сайте Государственного комитета по имуществу **www.gki.gov.by** в разделе «Продажа акций» в подразделе «Аукционы-конкурсы».

**Контактный телефон Фонда государственного имущества: (017) 284 85 62.**


**ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА**

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**

**Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.**
**Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**
**Кантактны тэлефон: 292-44-12.**
**e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by**
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 17.05.2011 г.**

Прамая лінія

# КАБ НЫРКІ НЕ НАПАТКАЛА НЕДАСТАТКОВАСЦЬ

**На пытанні чытачоў адказваў член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Заслужаны дзеяч навук Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык 1-й кафедры дзіцячых хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аляксандр СУКАЛА.**

**(Працяг. Пачатак у нумары за 17 мая.)**

***☎— Бабруйск, Аліса. Нашай дзяўчынцы 6 гадоў, займаецца фігурным катаннем. Часта бываюць цыстыты. Як гэтага пазбегнуць?***

— Па-першае, падчас заняткаў дзіця не павінна цярпець ці забывацца наведваць прыбіральню. Мачыцца трэба рэгулярна — для дзіцяці такога ўзросту аптымальным лічыцца каля 8 разоў у суткі, і трэніроўкі не павінны перашкаджаць натуральнаму працэсу. Па-другое, нельга забывацца на бактэрыяльнае паходжанне цыстыту, калі праблему выклікае звычайная кішэчная палачка. Ёсць яшчэ гранулярны цыстыт, які выклікаецца хламідыямі, але для таго, каб гэта высветліць, неабходна рабіць цыстаскапію. Па-трэцяе, лядовая трэніроўка не выключае фактару пераахаладжэння. Пераахаладжэнне прыводзіць да затрымкі мачы і, як следства, — да цыстыту. Тут я дадаў бы яшчэ вось што: пры з'яўленні падобных праблем у падобных сітуацыях бацькам дзяўчынкі трэба добра думаць, чаго ім хочацца больш — выхаваць здаровае дзіця ці хворага алімпійскага чэмпіёна. Я не баюся сказаць, што вялікі спорт яшчэ нікому не дадаў здароўя.

***☎— Магілёўская вобласць, Валерый. Нашаму дзіцяці 11 месяцаў. А з якога ўзросту можна саліць ежу?***

— Калі гатуецца мясны булён, а ў 11 месяцаў ужо даюць мясны булён, то на кончыку нажа яго можна зусім крыху прысаліць. Сутачная патрэба чалавека ў павараной солі складае каля 500 мг, але сучасны чалавек ужывае значна больш. Гэта звязана не з патрэбай нашага арганізма, а з нашымі традыцыямі. Кашу, суп можна і не саліць, але мы гэта робім толькі таму, што так робяць нашы матулі, рабілі нашы бабулі. Стандартны — 800 г — бохан чорнага хлеба ўтрымлівае каля 7,5-8 г солі. Так што калі вы ўжываеце 50 г чорнага хлеба, то вы ўжо цалкам задавальняеце сваю сутачную патрэбу ў солі. Але ж натрый хлор ёсць у дастатковай колькасці і ў мясе, у гародніне.

***— У нашай старэйшай дачкі — ёй 9 гадоў — зменшылася вага, з'явіліся сінякі пад вачамі... Гэта можа ўказваць на неабходнасць абследавання нырак?***

— Ныркі нагадваюць аб сабе ў першую чаргу ацёкамі. На нагах ці пад вачамі — гэта ўжо залежыць ад характару паражэння. Зніжэнне вагі для ныркавай паталогіі наогул не характэрна. Калі функцыя нырак парушаецца, то вада затрымліваецца, а значыць, вага, хутчэй за ўсё, нарастае. Калі дзіця пачало горш есці — значыць, у першую чаргу варта абследаваць страўнікава-кішачны тракт. З'яўленне сінякоў пад вачамі можа быць вынікам інтаксікацыі. Я не хачу сцвярджаць, што ў вашага дзіцяці абавязкова ёсць нейкае цяжкае захворванне, аднак вядомы цэлы шэраг хвароб — напрыклад, туберкулёз, паражэнні органаў дыхання, для якіх можа быць характэрна тое, пра што вы кажаце. Паталогіі органаў дыхання часта звязаны з паражэннем органаў стрававання, вось чаму такія людзі — худыя.

Самы просты спосаб вызначыць, наколькі здаровыя ў дзіцяці ныркі, — здаць агульны аналіз мачы. Прычым здаваць варта на працягу трох дзён. Далей урач павінен уважліва ацаніць гэтыя паслядоўныя аналізы, і не толькі на наяўнасць бялку, але і па ўсіх іншых паказчыках.

***— А на якія праблемы можа ўказваць выяўленне ў мачы крыві?***

— На вялікае мноства праблем — пухліна ныркі, мочакаменная хвароба, туберкулёз ныркі, гламерулянефрыт, гемарагічны цыстыт, траўма ныркі або мачавога пузыра і г.д. Наогул за суткі нармальная здаровая нырка можа выдаляць 1 млн эрытрацытаў, 2 млн лейкацытаў і 20 тыс. цыліндраў. Калі ў агульным аналізе мачы выяўлена 4-5 лейкацытаў, 2-3 эрытрацыты, то гэта норма. Калі ж мы бачым 10-15 эрытрацытаў, тым больш гэта будзе падставай для разважанняў. А разважаць неабходна над тым, які аддзел мочавыдзяляльнай сістэмы — верхні, сярэдні ці ніжні — «паспрыяў» такому аналізу мачы. Для дасследавання бярэцца так званая трохшклянная проба, калі неабходна памачыцца па чарзе ў тры шклянкі. Першая шклянка пакажа нам сітуацыю ў нырках, другая — у мачаточніку і трэцяя — у мачавым пузыры і мочавыдзяляльным канале.

***☎— Гродна, Галіна Міхайлаўна. У майго 9-гадовага сына энурэз. Ён саромеецца быць у дзіцячых калектывах, дзе трэба заставацца начаваць, напрыклад, у аздараўленчым лагеры. Урачы прычыны гэтай нямогі не знаходзяць. Гавораць, што дзіця можа праблему перарасці. Ці так гэта?***

— Калі дзіця ва ўзросце пасля 5 гадоў не кантралюе ўласнае мочаспусканне, трэба шукаць прычыны гэтага. А прычын можа быць некалькі: у прыватнасці, гіперактыўны або гіпаактыўны мачавы пузыр, а таксама неўралагічная паталогія. Таму чакаць, калі дзіця перарасце праблему, не варта. Хлопчык ужо цяпер саромеецца быць у дзіцячых калектывах, а калі «перарастанне» зацягнецца да 18 гадоў? Падлетак можа вырасці з вялікімі комплексамі. Вам неабходна звярнуцца да спецыялістаў. У Гродне, дарэчы, дзейнічае вядомая ўралагічная школа. Можна прыехаць і да нас, у Мінск, у Рэспубліканскі цэнтр дзіцячай нефралогіі і нырачнай замяшчальнай тэрапіі, які знаходзіцца на вуліцы Нарачанская, 17. У парадку жывой чаргі вы зможаце атрымаць кансультацыю ў нашым паліклінічным аддзяленні.

***— А ўсё ж, ці можна гэта перарасці?***

— Можна. Але ж, паўтаруся, я не раю гэтага рабіць. Псіхалагічная траўма будзе надта вялікая. З праблемай можна справіцца. Зараз існуе шмат добрых медыкаментозных і фізіятэрапеўтычных сродкаў. Вашаму хлопчыку можна дапамагчы.

***☎— Барысаў, Святлана Іосіфаўна. Скажыце, калі ласка, якія сімптомы могуць сведчыць пра тое, што ў дзіцяці развіваецца пахвінная грыжа?***

— Самы яўны сімптом — гэта выпукласць у пахвіннай вобласці. Калі грыжа трапляе ў так званыя грыжавыя вароты, то выпінаецца частка кішкі. Потым можа з'явіцца цягнучы боль ў пахвіннай вобласці з таго боку, з якога фарміруецца грыжа, або з двух бакоў, калі грыжа двухбаковая. Калі з'явіліся самыя нязначныя падазрэнні на грыжу, абавязкова трэба пракансультавацца ў хірурга.

Сама па сабе пахвінная грыжа не смяротная, а вось яе зашчамленне, калі вытыркаецца вялікі фрагмент кішкі і потым зашчамляецца ў грыжавых варотах, патрабуе экстраннага хірургічнага ўмяшання. Калі своечасова не прааперыраваць пацыента, давядзецца выдаляць частку кішэчніка. Таму хворым на грыжу лепш назірацца і лячыцца планава.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***


## Извещение о проведении 21 июня 2011 г. открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Наименование и характеристики продаваемого имущества** | Здание специализированное для металлургического производства и металлообработки общей площадью 1010 кв.м (инв. номер 500/С-3853 ) с дворовыми сооружениями и элементами благоустройства (кирпичное и металлическое ограждение, проезд, две площадки с асфальтовым и цементно-песчаным покрытием) |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Социалистическая, 18а |
| **Сведения о земельном участке** | Продаваемое здание расположено на земельном участке площадью 0,3725 га с кадастровым номером 500000000002002708 |
| **Сведения о собственнике** | ОАО «Минский автомобильный завод», г. Минск, ул. Социалистическая, 2 |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, (017) 227 40 22 |
| **Начальная цена** | 1 380 477 200 белорусских рублей без НДС. |
| **Сумма задатка** | 138 000 000 белорусских рублей |

Здание обременено договорами аренды.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 7 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли продажи по согласованию с продавцом.

Аукцион состоится **21 июня 2011 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 23.05.2011 по 17.06.2011 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22.**


Доктар адказвае

# Адэнома — не рак. «Не выяўлена» — значыць, здаровы. А дысбактэрыёз не лечыцца часнаком

**Шаноўныя чытачы, вы павінны разумець, што адна справа — адказваць на вашы пытанні ў межах тых жа «прамых ліній», на якія мы запрашаем самых розных спецыялістаў, у тым ліку, напрыклад, анколагаў, і зусім іншая справа — лаканічна і проста расказаць на старонках грамадска-палітычнага выдання аб тым, чаму спецыялісты-медыкі вучацца ўсё сваё прафесійнае жыццё. Пытанні, якія мы атрымліваем, сведчаць аб адсутнасці спроб знайсці адказ з дапамогай лечачага ўрача, які абследаваў канкрэтнага пацыента і ведае яго ўзрост, спадарожныя захворванні, асаблівасці працякання асноўнага захворвання і г.д.**

**Калі ласка, вазьміце на ўзбраенне вельмі простыя парады. Не спрабуйце разбірацца ў захворваннях так, як у гэтым разбіраюцца спецыялісты. Заўсёды ўважліва слухайце ўрачоў, калі ў вас ёсць пытанні — задавайце іх. Але майце на ўвазе, што пастаноўка дыягназу, бывае, патрабуе працяглага часу. Тут як і з судовым разборам: прысуд не выносіцца па першым уражанні ад падазронай асобы. Так што часам трэба проста набрацца цярпення.**

**Калі ласка, НІКОЛІ не займайцеся самалячэннем! У XXI стагоддзі нават неяк няёмка пра гэта і гаварыць. Паверце, калі б замовамі можна было б лячыцца, ніхто не ўкладваў бы мільярды долараў у распрацоўку новых прэпаратаў. Не забывайцеся і аб тым, што ніводная, нават самая дарагая пілюля не зрабіла старога маладым. Трэба больш цвяроза ставіцца да аб'ектыўнай рэальнасці і больш высокія патрабаванні прад'яўляць да саміх сябе — займацца прафілактыкай захворванняў! Калі ж захворванне прыйшло — лячыцеся ў спецыяліста. Калі лячэнне выклікае пабочныя эфекты, пагаршае самаадчуванне, гэта не значыць, што ад яго варта адмовіцца, а ўказвае на неабходнасць новага звароту да спецыяліста.**

✉ ***«Патлумачце, што гэта за хваробы — гангліянейрабластома і гістыяцытома фіброзная злаякасная? Ці даюць яны метастазы і г.д.?***

**г. Віцебск,** *сям'я Андрэевых».*

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім клінічным анкалагічным дыспансэры, гангліянейрабластома — гэта даволі рэдкая пухліна з нервовай тканкі. Часцей за ўсё сустракаецца ў дзяцей. Фіброзная злаякасная гістыяцытома — гэта пухліна мяккіх тканак рознай лакалізацыі. Любыя злаякасныя пухліны могуць даваць метастазы. Што да лячэння, то па паказаннях прымяняецца спачатку хірургічнае ўмяшанне, а затым праводзіцца хімія- і прамянёвая тэрапіі. Прагнозы будуць залежаць ад канкрэтнай сітуацыі.

З вашага пісьма незразумела, каму выставілі падобны дыягназ, па якой прычыне ў вас нарадзілася такое пытанне і якой менавіта дапамогі вы чакаеце ад рэдакцыі, а таму возьмем на сябе смеласць параіць назірацца ва ўрачоў-анколагаў, выконваць усе іх рэкамендацыі, ні ў якім разе не займацца самалячэннем і не шукаць экстрасэнсаў, гадалак і іншых людзей экзатычных прафесій, якія не вылечылі яшчэ ніводнага хворага на рак. Калі ласка, давярайцеся прафесіяналам і задавайце ім пытанні, якія вас хвалююць.

✉ ***«Сваячцы ў Гродне паставілі дыягназ «на момант агляду пераканаўчых даных за псіхічнае захворванне не выяўлена». Дык яна псіхічна здаровая або не? На словах урач сказаў, што яна здаровая, але ж чаму тады так і не напісаць — «псіхічна здаровы»? Сваячка цяпер ночы не спіць...***

**г.Орша,** *Адамовічы».*

<u>**Асістэнт кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Іна ПЯТНІЦКАЯ:**</u>

— Пацыент павінен уважліва слухаць, што кажа яму ўрач падчас прыёму. Калі нешта падаецца незразумелым, варта адразу ж і ўдакладніць. На практыцы можа прымяняцца як форма адказу «на момант агляду псіхічных парушэнняў няма», так і «псіхічна здаровы». Удакладненне «на момант агляду» дадаецца таму, што ўрач-псіхіятр ніводнаму пацыенту не ў стане гарантаваць адсутнасць псіхічных захворванняў да канца яго жыцця. Наогул дыягназ выстаўляецца паводле некалькіх дыягнастычных крытэрыяў. Калі іх недастаткова, то дыягназ, зразумела, не можа быць выстаўлены, аб чым сведчыць адзін з вышэйзгаданых варыянтаў урачэбнага адказу.

✉ ***«У брата адэнома прастаты, баліць ніз жывата... ПСА — 3,6. Сябры сказалі, што «як будзе 4, то гэта рак, маўляў, трэба зараз рабіць аперацыю». Што ўсё ж такі можна яму параіць?***

**г. Орша,** *Адамовічы».*

<u>**Загадчык аддзялення анкаўралогіі Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Ігар МАСАНСКІ:**</u>

— Дыягназ раку пры вышэйназваным паказчыку ПСА — на ўзроўні 3,6-4 — малаверагодны. Часцей за ўсё, у такой сітуацыі размова не ідзе аб пухліннай паталогіі. Лічба 4 — гэта ўмоўная мяжа, калі могуць прызначацца далейшыя спецыяльныя даследаванні: напрыклад, ультрагукавое даследаванне прастаты праз прамую кішку, біяпсія прастаты. Тактыку лячэння прастаты ў выпадку з вашым братам павінен вызначыць урач-уролаг, які ведае сітуацыю больш дакладна, пачынаючы з узросту пацыента.

✉ ***«...Вельмі даўно мне паставілі дыягназ — астэахандроз, і сказалі, што звужэнне сасудаў звязана з ім і што лячэння практычна няма. З цягам часу мне станавілася горш, але пазваночнік не балеў, і я падумала, што, мабыць, астэахандрозу ў мяне няма, і стала шукаць сваё лячэнне...***

***...У сталым узросце малако арганізмам засвойваецца звычайна кепска. У мяне таксама было такое. Урачы лячэння не прапануюць. Аднойчы я вырашыла папіць левамецыцін. Піла па 1-2 у дзень, некалькі дзён. Пасля гэтага я пачала есці малочныя прадукты — і зараз ніякіх праблем не ўзнікае... У чалавека ў страўніку і кішэчніку разводзіцца многа ўсякіх бактэрый, ад якіх бродзяць малако і малочныя прадукты, а левамецыцін іх вынішчае...***

***...Дысбактэрыёз я вылечыла часнаком. Трэба нашча з'есці зубок часнаку, есці 7 дзён. Нейкі час нічым не запіваць і не заядаць...***

**Лунінецкі раён,** *Ніна Іванаўна».*

<u>**Дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў ВАРОНІНА:**</u>

1. — Дыягназ «астэахандроз» выстаўляецца тэрапеўтам або неўролагам. Захворванне звязана з дэгенератыўнымі зменамі ў міжпазванковых дысках. Акрамя таго, да працэсу паступова далучаюцца дыстрафічныя змены суставаў пазваночніка — развіваецца артрыт, артроз. Вышыня пазваночнага слупа змяняецца, а значыць, адбываецца зашчамленне тканак, назіраецца і ішэмія, якая заўсёды звязана з болевым сіндромам. Косць сама па сабе, вядома ж, не баліць — пацыенты звычайна скардзяцца на боль у тканках, мышцах, якія акружаюць пазваночнік. Астэахандроз часта звязаны з узростам, хоць падобныя дыстрафічныя змены могуць назірацца і ў маладых людзей. У любым выпадку праблема цесна звязана са змяншэннем рухальнай актыўнасці, часцей пакутуюць людзі з лішняй вагой. Астэахандрозу спрыяе і зніжэнне ў крыві $CO_2$ — натуральнага сасудапашыральніка, што спрыяе дэгенератыўным і дыстрафічным працэсам у пазваночніку. Уплывае і ўзровень гармонаў.

Асноўнымі рэкамендацыямі пры такім захворванні будуць спыненне набору вагі або зніжэнне вагі і актыўны лад жыцця. Актыўны лад жыцця не мае на ўвазе корпацца цэлы дзень у агародзе. Размова ідзе пра неабходнасць выканання розных фізічных практыкаванняў, у тым ліку тых, што спрыяюць умацаванню мышцаў спіны. Варта адмовіцца ад лішку солі, жывёльных тлушчаў у харчаванні, лепш актыўна ўводзіць у рацыён кісламалочныя прадукты і ўжываць дастатковую колькасць вады. Пры некаторых станах паказана выкарыстанне супрацьзапаленчай тэрапіі, сродкаў, якія паляпшаюць мікрацыркуляцыю і г.д. Вельмі добра для прафілактыкі і лячэння астэахандрозу падыходзіць плаванне, заняткі ёгай, гімнастыка, гразелячэнне, іголкатэрапія. Але гэта — пасля зняцця вострага працэсу.

2. — У многіх людзей з узростам мяняецца ферментны склад кішэчніка, і малако дрэнна засвойваецца, што праяўляецца ў выглядзе дыспепсіі — гэта ўздуцце жывата, вадкі стул ці, наадварот, запоры. Як правіла, такая рэакцыя не ўзнікае на кісламалочныя прадукты, сметанковае масла, таму іх можна смела пакідаць у рацыёне, а ў кашу варта дадаваць малако, разведзенае напалову з вадой.

Што да левамецыціну, то гэта вельмі таксічны антыбіётык. Яго нельга прымаць без прызначэння ўрача. Тым больш, такі доўгі час. У процілеглым выпадку можна забяспечыць сабе ўскладненні з боку нырак, печані, можна дабіцца і вельмі моцнага парушэння мікрафлоры кішэчніка. Левамецыцін можа аказаць сваё таксічнае ўздзеянне на цэлы шэраг органаў і сістэм, нават на нервовую і кроватворную.

3. — Часнок сам па сабе вельмі карысны, гэта цудоўны імунастымулятар. Ужыванне аднаго зубка на працягу некалькіх дзён не нашкодзіць. Аднак лічыць часнок лекам нельга. Тут узнікаюць пытанні: хто выставіў вам дыягназ «дысбактэрыёз», які мікробны спектр пераважаў менавіта ў вас? Пастаноўка такога сур'ёзнага дыягназу патрабуе грунтоўнага мікрабіялагічнага даследавання.

Наш арганізм — вельмі складаны сімбіёз паміж макра- і мікраарганізмамі. Гэта стабільнасць і забяспечвае нам здароўе, абарону не толькі ад вірусаў і бактэрый, але і ад таксічных рэчываў і нават канцэрагенаў. Нармальны склад мікрафлоры неабходны для нармальнай жыццядзейнасці. Інакш не будзе здаровай нават сардэчна-сасудзістая сістэма. Якраз адсюль родам і ранняя ішэмічная хвароба сэрца, і артэрыяльная гіпертэнзія, і атэрасклероз. Нават невялікі зрух у мікробнай флоры выклікае пэўныя змены, а запушчаны працэс наогул пагражае вострай кішэчнай інфекцыяй.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


## Извещение о проведении 21 июня 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

| Номер предмета торгов | № 1 | № 2 | № 3 | № 4 | № 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| **Наименование и характеристики продаваемого имущества** | помещение многофункциональное общей площадью 409,9 кв.м, инвентарный номер 500/D-708002864 (производственно-бытовое) | помещение многофункциональное общей площадью 280,2 кв.м, инвентарный номер 500/D-708002865 (производственное с адм. помещениями) | склад (складское помещение) общей площадью 10,1 кв.м, инвентарный номер 500/D-708002866 | металлический склад общей площадью 488,2 кв.м (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | здание специализированное иного назначения общей площадью 249,4 кв.м (здание специального назначения) |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Ваупшасова, д. 3В, корп. 1, пом. 1 | г. Минск, ул. Ваупшасова, д. 3В, корп. 1, пом. 2 | г. Минск, ул. Ваупшасова, д. 3В, корп. 1, пом. 3 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 3Г/1 | г. Минск, ул. Радиальная, 25 |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, ком. 10, 220030, г. Минск | | | | |
| **Балансодержатель** | Строительно-монтажное открытое акционерное общество «Белзаводстрой» | | | | |
| **Начальная цена** | 541 125 000 белорусских рублей | 376 776 000 белорусских рублей | 12 555 000 белорусских рублей | 545 432 000 белорусских рублей | 503 837 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 54 000 000 белорусских рублей | 37 000 000 белорусских рублей | 1 200 000 белорусских рублей | 54 000 000 белорусских рублей | 50 000 000 белорусских рублей |

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **21 июня 2011 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 19.05.2011 по 17.06.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»**
**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

**режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 227 52 36, 226 03 01**

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2010 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52 и др.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану» в г. Минске.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/451-3910 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 03 марта 2010 г.

Земельный участок площадью 0,1672 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано из трех секций, первая и вторая – 10 этажные, третья – 13 этажная. Количество жилых помещений жилого дома – 149. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – декабрь 2010 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – июль 2012 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 06.08.2010 № 871-15/10 с дополнениями № 1763-15/10 от 24.01.2011 и № 871-15/10 от 23.03.2011.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий на строительство квартир с № 3 по № 72, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир с № 73 по № 149, № 1 и № 2.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 3 695 332 руб. – для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, получающих господдержку; 3 993 134 руб. – для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий; 4 693 776 – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 12.11.2010 № 1/10, генподрядчик – ПКУП «Монолит».

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться со дня выхода проектной декларации в каб. 105, по адресу г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

**Генеральный директор Е.И. Вовна**



## РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПОЛОЦКОГО РАЙОННОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА**

**ЛОТ № 1:** Кап. строение инв. № 250/С-36273 (магазин), площ. 111,4 м.кв. по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Вороничский с/с, д. Меница, ул. Центральная, д. 6а, начальная цена продажи **28 601 280** руб. с учетом НДС. Для обслуживания выделен зем. участок 0,0421 га.

**ЛОТ № 2:** Кап. строение инв. № 250/С-35280 (магазин № 46), площ. 117,3 м.кв. по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Вороничский с/с, д. Вороничи, начальная цена продажи **28 055 040** руб. с учетом НДС. Для обслуживания выделен зем. участок 0,0298 га.

**ЛОТ № 3:** Кап. строение – здание котельной инв. № 250/С-35280, площ. 147,1 м.кв., по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Космонавтов, д. 214а, начальная цена продажи **56 347 312** руб. с учетом НДС. Для обслуживания выделен зем. участок 0,0319 га.

1. Аукцион состоится **17 июня 2011 в 12.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 8.00 до 17.00 до 16.06.2011 (включительно)** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников **16.06.2011 с 11.30 до 12.00** по месту проведения аукциона. Официальное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.02.2011 г. № 30.

2. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением, разработанным в РУП «Витебский институт недвижимости и оценки». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

**Дополнительную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0212) 435 435, 435 495; 8 (029) 591 00 02.**



**27 мая 2011 года в 12.00** состоится повторное внеочередное общее собрание акционеров

**ОАО «МИНСКЭНЕРГОСТРОЙ»**

<u>**Повестка дня:**</u>
1. О сделках общества.
Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39. Начало регистрации в 11.30.

*УНП 100008291*



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**на 9-секционный 11-19-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (1-й пусковой комплекс - Блок А) по генплану № 1 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» по пр. Дзержинского в г. Минске**

**Информация о застройщике:**

Застройщик: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Синтез-Белнеп Строй», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 04 декабря 2003 года № 2057, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190501210.

Адрес: 220070, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18.

Режим работы: Пн.–Пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00.

Телефон: (017) 246 48 89, Факс: (017) 246 44 47.

До настоящего проекта организация не осуществляла функции застройщика жилых домов и иных объектов недвижимости.

**Информация о проекте строительства:**

Цель проекта строительства – строительство 9-секционного 11-19-этажного многоквартирного жилого дома со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (1-й пусковой комплекс - Блок А) по генплану № 1.

Здание многоквартирного жилого дома запроектировано из 9 секций, общая площадь жилого здания 57 333,02 м². Количество жилых помещений (квартир) – 600, из них: однокомнатных – 114, двухкомнатных – 232, трехкомнатных – 220, четырехкомнатных – 20, пятикомнатных – 8, шестикомнатных – 6. Каждая секция оборудована мусоропроводом, двумя пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные балконы и лоджии). В 2-х, 3-х, 4-х, 5-ти и 6-ти комнатных квартирах ванные комнаты с естественным освещением. Конструкция здания – каркасно-монолитное сооружение. На 1-м этаже здания расположены встроенные помещения общественного и административного назначения: офисные помещения общей площадью – 3 107,57 м²; аптека общей площадью – 173,23 м²; отделение связи общей площадью – 178,86. В зоне верхнего технического этажа – мастерские творческих организаций, общей площадью 1094,74 м². Количество машино-мест подземной гараж-стоянки – 135.

Многоквартирный жилой дом расположен по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, д. 131.

**Начало строительства – февраль 2008 года.**

**Окончание строительства – IV квартал 2011 года.**

Проектно-сметная документация в установленном порядке прошла:

- государственную экспертизу (заключение РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» от 06.09.2007 № 1979-07 с дополнениями к заключению от 30.12.2008 № 3227-5/08; от 04.06.2010 № 399-15/10; от 03.01.2011 № 1781-15/10; от 28.03.2011 № 05-01/2212).

- государственную экологическую экспертизу (заключение № 158 от 11.06.2007).

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки общей площадью 10,8623 га решениями Минского горисполкома от 15 ноября 2007 года № 2679, от 03.03.2011 № 516. Собственником земельных участков является Республика Беларусь. Свидетельства (удостоверения) № 500/141-3252 от 10.01.2008, № 500/141-3247 от 10.01.2008, № 500/141-3248 от 10.01.2008, № 500/141-3251 от 10.01.2008, № 500/141-3250 от 10.01.2008, № 500/1028-2025 от 11.05.2010 выданы Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

**Для физических лиц, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается к заключению договора создания объекта долевого строительства 4 (четыре) квартиры, из них:**

- трехкомнатные – 3 (три) квартиры общей площадью (90,99 - 91,98) м². Стоимость одного метра квадратного в белорусских рублях на дату публикации проектной декларации (18.05.2011 г.) составляет 5 008 000 (Пять миллионов восемь тысяч) бел. руб., что эквивалентно 1600 (тысяча шестьсот) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является фиксированной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

- двухкомнатная – 1 (одна) квартира общей площадью (70,33) м². Стоимость одного метра квадратного в белорусских рублях на дату публикации проектной декларации (18.05.2011 г.) составляет 5 008 000 (Пять миллионов восемь тысяч) бел. руб., что эквивалентно 1600 (тысяча шестьсот) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является фиксированной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

**Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается к заключению договора создания объекта долевого строительства 9 (девять) квартир:**

- трехкомнатные – 2 (две) квартиры общей площадью (90,99;91,98) м². Стоимость одного метра квадратного в белорусских рублях на дату публикации проектной декларации (18.05.2011 г.) составляет 5 101 900 (Пять миллионов сто одна тысяча девятьсот) бел. руб., что эквивалентно 1630 (тысяча шестьсот тридцать) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является фиксированной в долларовом эквиваленте на весь период строительства,

- двухкомнатные – 3 (три) квартиры общей площадью (66,73 – 70.98) м². Стоимость одного метра квадратного в белорусских рублях на дату публикации проектной декларации (18.05.2011 г.) составляет 5 164 500 (Пять миллионов сто шестьдесят четыре тысячи пятьсот) бел. руб., что эквивалентно 1650 (тысяча шестьсот пятьдесят) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является фиксированной в долларовом эквиваленте на весь период строительства,

- однокомнатных – 4 (четыре) квартиры общей площадью (44,46-52,36) м². Стоимость одного метра квадратного в белорусских рублях на дату публикации проектной декларации (18.05.2011 г.) составляет 5 634 000 (Пять миллионов шестьсот тридцать четыре тысячи) бел. руб., что эквивалентно 1800 (тысяча восемьсот) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является фиксированной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

**Для физических и юридических лиц предлагаются на 1-ом этаже к заключению договоров 7 нежилых помещений:**

- помещение № 5 – общей площадью 210,18 м²;
- помещение № 7 – общей площадью 168,42 м²;
- помещение № 8 – общей площадью 197,14 м²;
- помещение № 9 – общей площадью 212,27 м²;
- помещение № 10 – общей площадью 199,34 м²;
- помещение № 11 – общей площадью 210,18 м²;
- помещение № 17 – общей площадью 297,89 м²

К заключению договоров долевого строительства предлагаются творческие мастерские (13 нежилых помещений) общей площадью 28,85 -66,35 м².

**Для физических лиц предлагаются к заключению договоров создания объекта долевого строительства (подземной автостоянки) 20 (двадцать) машино-мест (20 долей из 135 в праве собственности на подземную автостоянку) стоимостью за одно машино-место (1/135 доли в праве собственности на подземную автостоянку), 70 000 000 (семьдесят миллионов) белорусских рублей.**

Отделка квартир не выполняется.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи (за исключением находящихся в них творческих мастерских и иных нежилых помещений общественного назначения) и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками.

Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, дорожек, размещение площадок отдыха, детских и хозяйственных, устройство парковки на 219 машино-мест.

Договор генерального строительного подряда заключен по результатам подрядных торгов с СООО «СБСМОНТАЖСТРОЙ».

Договор комплексного управления инвестиционным проектом заключен с ООО «БНК инжиниринг».

Срок действия настоящей проектной декларации – до 18 июня 2011 г.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18, или по телефонам: (017) 246 47 43; 246 48 89, 611 33 33 (velcom), на сайте www.dolevoe.by.





Кропка на планеце



# СЯДЗІБА «МЕТАЛІСТА» ПАДДУБСКАГА



Паўн. шыр. 28°86'
Усх. даўж. 53°43'



МІША любіць метал. Метал любіць Мішу. Яшчэ яго любяць фарбы, старыя рэчы — напрыклад, гадзіннікі, самавары, якар з цеплахода. Несумненна, што Мішу Паддубскага любяць і птушкі, якія заўсёды селяцца на ягоным незвычайным падворку. Штогод вяртаюцца буслы, а што ўжо шпакоў... Птушкі не зважаюць на жалеза-пластыкавае суседства, не рэагуюць на спецыфічны шоргат, скрыгат, рып і бляск безлічы выпадковых прадметаў, прымацаваных у паветры на ўзроўні шпакоўняў і буслянкі.

— Бусел гняздуецца 70 гадоў, колькі хата стаіць, — кажа гаспадар. — Калі птушка не палохаецца, дык што казаць пра людзей?

Суседзі Мішу паважаюць і заўсёды пасігналяць, калі ўбачаць яго каля варот і тым больш з інструментам за працай.

Міхаіл Паддубскі — спецыяліст па метале, больш за 20 гадоў ён працаваў у раённай аварыйнай газавай службе. Кажа, што ў яго яшчэ шмат розных ідэй. І калі ў рукі патрапіць цікавы прадмет ці метал, ён абавязкова «ўпіша» яго ў кантэкст кампазіцыі свайго падворка. Але металу ўсё менш і менш, не тое што раней, калі пад кожным плотам былі сапраўдныя склады...

КАЛІ вам падасца, што ў эклектыцы афармлення дома № 61 па вуліцы Кастрычніцкай вёскі Святліца незразумелы сэнс, памыляецеся. І дарэмна ўсміхаецеся. Міша на поўным сур'ёзе тлумачыць:

— Стары якар я знайшоў на дне ракі Бярэзіна і паставіў у гонар загінулай атамнай падводнай лодкі «Курск». А серп і молат, — Міша паказвае рукою высока над варотамі, — знак пашаны маёй маці — нястомнай працаўніцы, якая выгадавала нас, чацвярых дзяцей.

Дзюралевыя зайцы на дроце, лось, зубры... Хто б мог падумаць, што гэта напамін пра першыя беларускія грошы. Памятаеце, іх яшчэ «зайчыкамі» называлі?

— Як думаеш, навошта рознакаляровыя бутэлькі па перыметры, ад няма чаго рабіць? — перахоплівае гаспадар мой пагляд, скіраваны на пластыкавую дэкарацыю. — Гэта вячэрняя ілюмінацыя, у кожнай пляшцы — лямпачка. Шкада, што дзень, нельга ўключыць, паглядзеў бы.

ЯШЧЭ мяне здзівіў дынамік пад буслiным гняздом. Аднак і тут не без падтэксту: калі з'яўляюцца буслікі і становяцца на ногі, гаспадар уключае ім музыку, каб танчылі. Кажа, што сапраўды птушаняты пачынаюць падскокваць, як толькі пачуюць гукі. А калі бусліха сядзіць на яйках, ніякай музыкі, поўная цішыня і спакой.

Пакуль мы асэнсоўвалі мастацкае афармленне сядзібы Паддубскага, па аўтамагістралі Р67 (праходзіць якраз праз вёску) несліся розныя аўто, і было відаць, як кіроўцы раптам паварочвалі галовы ў бок нетрадыцыйнага фасада. Бусліха тым часам выконвала свой спрадвечны абавязак — грэла яйкі. Шпакі снаўдалі туды-сюды, насілі ў дзюбах салому і корм для птушанят (магчыма, у шпачыных хатках сёлета зноў будзе па два вывадкі). На веласіпедзе нетаропка праехала аднавяскоўка Паддубскага, і я пачуў яе шчырае і прыязнае «добры дзень!»

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**
*Вёска Святліца, Бярэзінскі раён.*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.03 | 21.10 | 16.07 |
| Віцебск — | 4.46 | 21.06 | 16.20 |
| Магілёў — | 4.53 | 21.00 | 16.07 |
| Гомель — | 4.57 | 20.49 | 15.52 |
| Гродна — | 5.20 | 21.24 | 16.04 |
| Брэст — | 5.27 | 21.17 | 15.50 |

**Месяц**
*Поўня 17 мая.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**
**Пр.** *Ірыны, Абрама, Якава.*
**К.** *Аляксандры, Наталлі, Эрыка, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 18 мая

Дзве даты

**1906 год** — у Пецярбургу па ініцыятыве выкладчыка Пецярбургскага ўніверсітэта Б.І. Эпімах-Шыпілы заснавана першае легальнае беларускае выдавецкае таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца». Існавала ў 1906—14 гадах. Створана на кааператыўных пачатках групай перадавой беларускай інтэлігенцыі. Таварыства ставіла перад сабой асветніцкія задачы. Нягледзячы на цяжкае фінансавае становішча, адсутнасць паліграфічнай базы, цэнзурныя рэпрэсіі, выдала лацінкай і кірыліцай 38 назваў кніг агульным тыражом больш за 100 тысяч асобнікаў. Сярод іх першыя падручнікі на беларускай мове: «Беларуская чытанка, ці Першае чытанне для дзетак беларусаў» К. Каганца, «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі, творы Я. Купалы і Я. Коласа, мастацкую літаратуру, паштоўкі. У 1907-09 гадах наладзіла выданне падпіснoй серыі «Беларускія песняры», у якую ўвайшлі творы В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», «Вячэрніцы», «Шчараўскія дажынкі», Ф .Багушэвіча «Дудка беларуская», «Смык беларускі», пераклад паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Таварыства таксама выдавала альманах «Маладая Беларусь», выпускала навукова-папулярныя і публіцыстычныя брашуры, паштоўкі з пейзажамі Беларусі і партрэтамі беларускіх пісьменнікаў.




**1942 год** — у акупаваным фашыстамі Мінску з'явіўся першы нумар падпольнай газеты «Звязда» — органа Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б.

Цытата дня:

*«Толькі ў філосафаў і дзяцей ёсць адна высакародная рыса — яны не надаюць значэння ніякім адрозненням паміж людзьмі — ні сацыяльным, ні разумовым, ні знешнім».*
**Аркадзь Аверчанка (1881—1925), рускі пісьменнік.**

## СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

Капіраевальны апарат
Насенне найвышэйшага гатунку
Плямісты цюлень
Элемент фігурнага катання
Сола спевака ў спектаклі
Гатунак мяккіх цукерак
Умоўна ядомы грыб пры ўмелым гатаванні



Сістэма ровападобных паглыбленняў зямной кары
Сухая сенажаць, сухадол
Вялікае возера ў ЗША
Стадыён пад дахам
Трапічны плод з клубнямі да 4 кг
У міфалогіі: адзін з сыноў Ноя
Раман Ч. Айтматава
Сродак сувязі
Буйны паўзун-драпежнік
У грэчаскай міфалогіі: муза любоўнай паэзіі
Невялікая сібірская жывёла з аленяў
Французскі фізік, астраном, механік
«Шэры» папугай, аматар пабалбатаць
Плошча для сходаў у Стар. Грэцыі
Амерыканскі страус
Намеснік кіраўніка ў ВНУ
Лік аднаразовага вылічэння
Мянушка паліцэйскага ў Францыі
Грашовая адзінка ў Іране
Заліў Чырвонага мора
Горад у Бельгіі
Студзеністы полісахарыд
Грузападымальны механізм
Фестывальная кіна-«Мека»
Перамяшчэнне фігуры ў шахматах
Комплекс храмаў, палацаў у Кампучыі
Беларускі асветнік, мастак, гісторык
Дарожна-будаўнічы матэрыял
Даўней: народны вандроўны тэатр
Маладзевы сход
Асаблівы друкарскі сплаў
Горнае паселішча



Ядавіты плямісты грыб

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | | 5 | | | 7 | | 9 | |
| | | 4 | | 5 | | 3 | | 2 |
| | 9 | 3 | | | | | | |
| | | | | | | 6 | 3 | |
| 6 | | 2 | | 4 | | 5 | | |
| | 3 | | 8 | | | 4 | | 9 |
| 4 | | | | 1 | 2 | | | 5 |
| | | | | | | | | |
| 2 | | | 6 | 9 | | | | 3 |

**СУДОКУ.** У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

## Смачнае жыццё старога аўтобуса

Глыбінка

### У Чэрыкаве з'явілася кавярня на колах «Бусляня»

**Кавярня належыць Чэрыкаўскаму дзяржаўнаму прафесійнаму ліцэю № 11, дзе рыхтуюць спецыялістаў у галіне грамадскага харчавання. Перш за ўсё гэта магчымасць для навучэнцаў і папрактыкавацца ў прафесіі, і зарабіць грошы.**



Ідэя пераўтварыць спісаны аўтобус у перасоўную кавярню ўзнікла ў дырэктара ліцэя Анатоля Ляпешкі.

— Маладыя людзі па чарзе адпрацоўваюць навыкі прадаўца і афіцыянта, — расказвае ён. — Падругое, гэта крыніца заробку для ліцэя, які забяспечвае сваіх навучэнцаў бясплатным харчаваннем. І па-трэцяе, кавярня, безумоўна, стварае добры імідж нашай навучальнай установе.



Спачатку перасоўная кавярня брала ўдзел у розных кірмашах, а цяпер спынілася ў Чэрыкаве, непадалёк ад аўтастанцыі і парку адпачынку. Працуе штодзень, ад 14-й да 21 гадзіны. У кавярні 20 месцаў.

Назвалі яе «Бусляня» ў гонар птушак, якія селяцца штогод каля будынка ліцэя. Стыль — нацыянальны, таму ў меню пераважаюць смажанкі, булачкі і бліны, дапоўненыя сучаснай транснацыянальнай ежай — хот-догам, а таксама разнастайнымі напоямі.

У кавярні толькі 5% нацэнкі, таму цэны зусім не «кусаюцца»: смажанка — 1250 рублёў, бліны з рознымі напаўняльнікамі — ад 480 да 690, хот-дог — 1500 рублёў. Дэмакратычныя цэны прыцягваюць у «Бусляня» пераважна моладзь.

— Штодзень ходзім сюды пасля заняткаў, — расказалі дзяўчаты. — Вядома ж, добра, што тут усё даволі танна. Акрамя таго, цікава прыдумана — кавярня ў аўтобусе! Можна не проста паесці, але пасядзець і пагутарыць з сяброўкамі, расслабіцца і паглядзець у акно, падумаць.

Штодзень вучні ліцэя вырабляюць каля тысячы адзінак розных булак і прадаюць іх праз стацыянарны кафэтэрый і перасоўную кавярню. Штодзень ліцэй зарабляе 100 тысяч рублёў, і кіраўніцтва лічыць гэта неблагім вынікам.

Заробак прадаўцоў і афіцыянтаў — 5% ад тавараабароту, плюс прэміі за добрую працу.

— Але ўсё ж грошы — не галоўнае, — падкрэсліваюць у ліцэі. — Стасункі з пакупнікамі розных узростаў і катэгорый — гэта бясцэнная практыка.

— У нас сапраўды шмат наведвальнікаў, — расказала афіцыянтка Вольга Гарунова. — У асноўным маладыя людзі, і ўсе такія культурныя! Нам усё цікава: практыка, стасункі, заробак. Такіх кавярняў, як наша, павінна быць больш, тады і моладзі будзе дзе бавіць вольны час. Наша «Бусляня» на колах — гэта добра і арыгінальна!

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*г. Чэрыкаў.*

## СУХАЯ СЕРАДА

**Набажэнства, якое адбываецца ў чацвёртую нядзелю пасля Вялікадня, распавядае аб сувязі паміж грахом і немаччу, аб выратаванні, якое дае Гасподзь. У нядзелю ўслаўляецца цудоўнае выратаванне хворага, які на працягу 38 гадоў пакутаваў ад цяжкай хваробы, які «шмат гадоў чакаў дарэмна, каб хто-небудзь дапамог яму акунуцца ў гаючую крыніцу». Памяць аб гэтым цудзе святкуецца ў нядзелю таму, што Хрыстос здзейсніў яго ў час яўрэйскай Пяцідзясятніцы. Царква заклікае вернікаў звяртацца да Госпада па выратаванне не толькі ад фізічных хвароб, але і хвароб душы, аслабленай грахом.**

Серада на чацвёртым тыдні пасля Вялікадня — 25-ы дзень, сярэдзіна паміж Вялікаднем і Тройцай — мае некалькі найменняў: *Прапалавенне Пяцідзясятніцы, Серадапосніца, Пераплаўная, Прыпалоўная, Палавенская, Градавая, Грамавая, Сухая серада.*

На гэты дзень прыпадае палова перыяду ад Вялікадня да Тройцы. Праваслаўная царква ў дзень Прапалавення моліцца «аб наталенні ўсіх, хто прагне выратавання, водамі набожнасці: у гэты дзень Хрыстос пераконвае людзей у прынесеным ім выратаванні і прапаноўвае ўсім пакаштаваць з крыніцы бессмяротнасці». Пасля набажэнства адбываецца малое асвячэнне вады. Прапалавенне святкуецца восем дзён — ад серады чацвёртага тыдня да серады пятага тыдня пасля Вялікадня.

- Паходжанне аднаго з найменняў — Пераплаўная — можна знайсці ў паданні аб тым, як Багародзіца з немаўляткам, ратуючыся ад рабаўнікоў, атрымала ад Бога трэцюю руку, пераплыла вялікую раку і выратавала Ісуса.
- З Прапалавення («тады Ісус Хрыстос купаўся і пераплыў цераз мора») і да Ільі дазвалялася купацца ў прыродных вадаёмах. У Лельчыцкім раёне дазвалялася купацца да Спаса.
- У гэты дзень не працавалі, каб град не знішчыў пасевы ці не заліў іх дождж: «У Сухую сераду нельга дакранацца да насення і сеяць, бо збажына не будзе расці». Выключэнне складала толькі пасадка цыбулі, для якой лічылі спрыяльным менавіта гэты дзень.
- У гэты дзень сушылі зімовае адзенне. Лічылася, калі прасушыць яго ў Прыпалоўную — Сухую сераду, то яго не будзе «есці» моль.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся

Мяркуючы па выніках «Еўрабачання», сёлета Расія ні з адной дзяржавай не межавала.

☺

**— Не хлусі, ты пакінуў мне пячэнне не таму, што кахаеш мяне, а таму, што ў цябе больш не ўлезла...**

☺

Мікрааўтобус заехаў на лужок, і з яго выскачылі двое дарослых і чацвёра дзетак. Дзеці пачалі хутка разгружаць багаж і ставіць намёт. Хлопчыкі потым, як віхор, пабеглі збіраць галлё, а мама з дачкой узяліся за падрыхтоўку абеду. Побач размясцілася іншая сям'я, і яе глава звярнуўся да бацькі новапрыбылага сямейства:

— Так, вось гэта я разумею — арганізацыя працы. Як вам атрымалася дасягнуць такой зладжанасці?

— А ў мяне свая сістэма, — адказвае той, — пакуль усё не гатова, нікому не дазволена ісці ў прыбіральню...




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2343. Нумар падпісаны ў 19.30 17 мая 2011 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12